

# «АДНАЎЛЕННЕ АДНОСІН З ЗША ПАВІННА БУДАВАЦЦА ВЫКЛЮЧНА Ў БЕЛАРУСКІХ ІНТАРЭСАХ»

**На нарадзе ў Палацы Незалежнасці гаварылі аб перспектывах і нацыянальных прыярытэтах**

(Стар. 2–3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

15 КАСТРЫЧНІКА 2025 г. СЕРАДА № 199 (30587)



**З чаго пачынаецца распрацоўка новага і ўдасканаленне таго, што ёсць**

СТАР. 5

# ПА ВЫСОКІМ СТАНДАРЦЕ

Малады спецыяліст, тэхнік выпрабавальнага цэнтра БелДІСС Захар ЖУКАЎ рыхтуе вымяральнае абсталяванне для правядзення выпрабаванняў па электрамагнітнай сумяшчальнасці.

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

КАЛІ НА ІДЭЮ АДГУКАЮЦЦА СЭРЦАМ 10




Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

25199>

## ДА ЗОРАК І ПРАКТЫЧНЫХ МЭТ

**У Беларусі вызначаны стратэгічныя кірункі развіцця касмічнай галіны**



Наяўнасць уласнай касмічнай праграмы ставіць нашу краіну ў адзін шэраг з вядучымі сусветнымі дзяржавамі, садзейнічае росту яе міжнароднага прэстыжу і пацвярджае статус канкурэнтаздольнай дзяржавы з высокім навуковым і прамысловым патэнцыялам. Сярод ключавых прыярытэтаў — перадавыя навуковыя даследаванні космасу, міжнароднае супрацоўніцтва і меры па падтрымцы навукова-адукацыйных ініцыятыў у сферы.

СТАР. 12–13

# «АДНАЎЛЕННЕ АДНОСІН З ЗША ВЫКЛЮЧНА Ў БЕЛАРУСКІХ

## На нарадзе ў Палацы Незалежнасці гаварылі аб перспектывах

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сабраў нараду па пытаннях глабальнай міжнароднай абстаноўкі і развіцці беларуска-амерыканскіх адносін. На нарадзе ў кабінеце кіраўніка дзяржавы прысутнічалі Прэм'ер-міністр Аляксандр Турчын, дзяржсакратар Савета Бяспекі Аляксандр Вальфовіч, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрый Крутой, генеральны пракурор Андрэй Швед і старшыня КДБ Іван Тэртэль.



Фота БелТА.

«Я хацеў бы з вамі параіцца па шэрагу пытанняў. Нам трэба будзе абмеркаваць, перш за ўсё, пытанні глабальнай міжнароднай абстаноўкі: як яна характарызуецца, якое месца займае Беларусь у гэтай глабальнай сітуацыі. Гэта па-першае. Па-другое, вельмі важнае пытанне — адносіны нашай Беларусі са Злучанымі Штатамі Амерыкі», — абазначыў акцэнты нарады кіраўнік дзяржавы.

### МІЖНАРОДНАЯ АБСТАНОЎКА. РАШУЧЫ КРОК ДОНАЛЬДА ТРАМПА

«Прыход да ўлады адміністрацыі Дональда Трампа прывёў да таго, што міжнародныя адносіны пачалі вельмі хутка мяняцца. Трэба аддаць належнае, пры ўсіх недахопах, Дональд робіць рашучыя крокі ў свеце па рашэнні глабальных пытанняў.

**Апошнія падзеі на Блізкім Усходзе пры ўсіх недахопах (як бы тут ні практыкаваліся асобныя яго працаўнікі і палітолагі) — гэта рашучы і сур'ёзны крок, які спыніў баесутыкненне і вайну, — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. — Вядома, яшчэ трэба будзе нямала зрабіць. Рабілі мы дзесяцігоддзямі і ледзь не цэлае стагоддзе, парадак там наводзілі, так нічога і не зрабілі. Таму я абсалютна падтрымліваю гэтыя крокі прэзідэнта Злучаных Штатаў Амерыкі Дональда Трампа па навядзенні парадку на Блізкім Усходзе ў дадзеным выпадку».**

Гэты крок беларускі лідар назваў рашучым, добрым. Ён не выключае, у будучыні такія меры могуць прывесці да стварэння, можа быць, адзінай палесцінскай дзяржавы, куды ўвойдзе і сектар Газа. І, нарэшце, людзі атрымаюць там магчымасць нармальна жыць.

### НОБЕЛЕЎСКАЯ ПРЭМІЯ. АЦЭНКА ЛЮДЗЕЙ НАЙВАЖНЕЙШАЯ

Прэзідэнт выказаўся і з нагоды непрысуджэння Нобелеўскай прэміі міру Дональду Трампу і абяцанні, што ў наступным годзе ён яе дакладна атрымае. «Я асабіста параіў бы яму асабліва не перажываць, што не прысудзілі гэту Нобелеўскую прэмію. Таму што быць у шэрагу гэтых адшчапенцаў там, напэўна, яму не да месца. Людзі ў свеце павінны ацаніць тое, што робяць Злучаныя Штаты Амерыкі і іх Прэзідэнт на міжнароднай арэне. Гэта важней — ацэнка міжнароднай супольнасці і людзей у свеце, чым гэтай палітызаванай структуры, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Я часам так думаю, калі б камусьці з вас ці мне прапанавалі гэту прэмію, я сапраўды ад яе б адмовіўся. Ну, слухайце, мы ведаем па нашых «дзеячах», які ўклад яны ўнеслі ва ўсталяванне міру ў свеце наогул. Ды нічога не зрабілі. Наадварот — спрыялі і падштурхоўвалі Беларусь да гэтай так званай вайны. Ну і параўнаць апазіцыянерку з Венесуэлы (нічога не маю супраць, не ведаю пра яе палітыку, як і вы, напэўна, нічога не ведаеце). Ну вось узялі і далі, бо яна змагалася за разбурэнне Венесуэлы. Гэта нармальна?»

Кіраўнік дзяржавы не сумняваецца, што Дональд Трамп безумоўна атрымае Нобелеўскую прэмію міру. Але наша стаўленне да гэтай прэміі застанецца нязменным.

### БЕЛАРУСКА-АМЕРЫКАНСКІ ДЫЯЛОГ. БЕЗУМОЎНА, У НАШЫХ ІНТАРЭСАХ

Прэзідэнт адзначыў станоўчы імпульс у тэндэнцыі аднаўлення беларуска-амеры-

## Даслоўна

### «МЫ КІРУЕМСЯ ТОЛЬКІ

Старшыня КДБ Іван Тэртэль па выніках нарады расказаў журналістам, якія пытанні вынесеныя на парадак дня беларуска-амерыканскага дыялогу. «Я хацеў бы падкрэсліць, што некаторыя аспекты ў перагаворным працэсе (так прынята) да пары да часу павінны заставацца закрытымі, каб бакі знайшлі кансэнсус па спрэчных пытаннях, прыйшлі да адзінага меркавання. Я не адкрыю вялікага сакрэту, калі скажу, што з амерыканскім бокам ідзе сур'ёзнае абмеркаванне пытанняў на ўзроўні кіраўніка дзяржавы. Нашы амерыканскія партнёры прызнаюць, што мы, знаходзячыся ў гэтым рэгіёне, і наш кіраўнік дзяржавы, ведаючы абстаноўку, можам уносіць сур'ёзны ўклад у стабілізацыю сітуацыі», — удакладніў ён.

Старшыня КДБ патлумачыў, што не можа раскрыць усе аспекты, паколькі ў перагаворным працэсе павінна быць прастора для манеўру. «Мы настроены на дыялог, на пошук узаемапрымальных рашэнняў з улікам нашых нацыянальных інтарэсаў. Мы выпрацавалі свае прапановы, сваю перагаворную пазіцыю. Па шэрагу пытанняў мы ўжо прыйшлі да кансэнсусу з амерыканскім бокам. Але неабходна нашым партнёрам разумець, што ёсць нашы нацыянальныя інтарэсы, якія мы заўсёды будзем улічваць, і гэтаксама, як амерыканцы, прымяняць практычны, рацыянальны падыход у тым ліку да перагаворнага працэсу, выключна з улікам нашых нацыянальных інтарэсаў», — удакладніў старшыня КДБ. Паводле яго слоў, з улікам таго, што ў гэты працэс пагружаны кіраўнік дзяржавы, існуе разуменне пазіцыі прэзідэнта ЗША, ёсць усе шанцы на дасягненне прарыву ў адносінах з ЗША. Беларускі бок да гэтага адкрыты.

Па словах Івана Тэртэля, грунтоўная беларуска-амерыканская размова вядзецца па ўкраінскай тэматыцы. І яна ўжо прынесла істотную карысць для стабілізацыі сітуацыі ў рэгіёне. «Я хацеў бы адзначыць, што сітуацыя ва Украіне развіваецца па эскалацыйнай спіралі. Мы пакуль не бачым, што намаганні, якія робяцца, вядуць да завяршэння канфлікту. Наш Прэзідэнт пагружаны вельмі глыбока ў парадак дня і асабіста перажывае з гэтай нагоды. Ён разумее, што адбываецца на самай справе. Таму пазіцыя нашай краіны, нашага Прэзідэнта заключаецца ў тым, што мы можам зрабіць свой унёсак, мы разумеем і ўкраінскі, і расійскі бакі, мы маглі б знайсці кансэнсус

# ПАВІННА БУДАВАЦЦА ІНТАРЭСАХ»

## і нацыянальных прыярытэтах

канскага дыялогу. Пра гэта ўжо не аднойчы казалі. Кіраўнік дзяржавы паабяцаў у дэталях праінфармаваць насельніцтва, калі прыйдзе час.

За апошні час у Мінску адбыўся шэраг сустрэч са спецыяльнымі пасланнікамі прэзідэнта ЗША. Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, практыка паказала, што ўсе гэтыя кантакты амерыканцы праводзяць выключна ў прагматычных мэтах.

**«Безумоўна, наша палітыка на аднаўленне адносін з ЗША павінна будзе будавацца выключна ў беларускіх інтарэсах. Так, мы можам ісці на кампрамісы нейкія. Мы можам рабіць першымі крокі, чакаючы ад амерыканцаў, што яны абяцанае будуць выконваць», — заявіў беларускі лідар.**

У якасці прыкладу ён прывёў зняцце санкцый з авіякампаніі «Белавія». Тут, нягледзячы на заявы, яшчэ засталіся і нявырашаныя пытанні. Трэба час, каб «ліквідаваць хвасты».

«Будзем чакаць іх прапановы, «глабальнай вялікай здзелкі» (любяць яны гэтыя вялікія здзелкі). Мы да гэтага гатовыя. Мы гатовыя з імі заключыць вялікую здзелку. На адной шалі вагаў — іх пытанні, просьбы і патрабаванні. На іншай шалі вагаў — нашы пытанні і патрабаванні. Вырашаем. Давайце будзем вырашаць. Мы да гэтага гатовыя», — заявіў кіраўнік дзяржавы, падкрэсліўшы, што абсалютна нармальна ацэньвае прапановы Дональда Трампа ў гэтым плане. Але павінны быць улічаныя і нашы інтарэсы, усё павінна быць сумленна, зрабіў акцэнт Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы папярэдзіў, што варта ўлічваць тое, што на дадзены момант у дачыненні да Беларусі з боку ЗША і іх саюзнікаў, асабліва Еўрапейскага саюза, працягваюць дзейнічаць санкцыі.

**«Так, мы навучыліся жыць пад ціскам гэтых санкцый, працаваць, хоць не без праблем. Але яны існуюць. Яны нам шкодзяць, адцягваюць нас ад вырашэння многіх пытанняў, — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. — Амерыканскай адміністрацыяй рэалізуецца, на жаль, па-ранейшаму палітыка па прасоўванні нейкіх псеўдадэмакратычных каштоўнасцяў. Мы гэта таксама бачым. На словах яны нібы ад гэтага адышлі, а на справе — нічога падобнага. Але гэта іх справа, куды траціць грошы, а наша справа — бачыць свае інтарэсы», — арыентуе беларускі лідар.**

### УКРАІНСКІ КРЫЗІС. МІР І ТОЛЬКІ МІР

Яшчэ адно найважнейшае пытанне, на якое звярнуў увагу беларускі лідар, — урэгуляванне ўкраінскага канфлікту. «Дзеянні Вашынгтона праводзяцца як у кантэксце ўрэгулявання рэгіянальнага крызісу вакол Украіны, так і ў мэтах рэалізацыі сваіх інтарэсаў ва Усходняй Еўропе і ў цэлым свеце. Гэта нармальна.

**Калі амерыканцы хочуць урэгуляваць канфлікт ва Украіне і бачаць там нейкую невялікую нашу ролю, мы гатовыя ў гэтым удзельнічаць. Мы пра сваю пазіцыю заявілі — мір і толькі мір. Украіна павінна існаваць як суверэнная незалежная дзяржава. Мы хочам, каб вайна была спыненая цяпер, інакш знікне гэта незалежная суверэнная дзяржава», — адзначыў ён.**

Тым больш, звярнуў увагу беларускі лідар, некаторыя суседзі ўжо пазіраюць на заходнія вобласці Украіны, ды і Беларусі таксама. Ужо жывуць «святым духам Пілсудскага», іранічна заўважыў ён.

**«Для нас суверэнная незалежная Украіна — гэта вялікае галоўнае пытанне. Яна павінна быць міралюбівай, нікому не ствараць ніякіх праблем і пагроз. Развівацца як незалежная дзяржава. Мы за гэта. Мы за мір. І ў гэтым плане гатовыя працаваць», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.**

Ён адзначыў, што апошнія сустрэчы з Прэзідэнтам Расіі сведчаць, што расійскі бок таксама накіраваны на ўсталяванне міру. «Ніякія «тамагаўкі» пытанне не вырашаць. Гэта эскаліруе сітуацыю да ядзернай вайны. Напэўна, лепш за ўсіх сітуацыю разумее Дональд Трамп, які не спяшаецца аддаваць такую смяротную зброю і дазваляць біць углыб Расіі, як на гэта разлічвае прэзідэнт Зяленскі», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, Беларусі як найбліжэйшаму саюзніку Расіі ў пытанні вырашэння ўкраінскага крызісу і выбудоўвання архітэктуры рэгіянальнай бяспекі, адводзіцца пэўная роля.

**«Амерыканцы ў гэтым пытанні нас убачылі. У нас ёсць канкрэтныя магчымасці і патэнцыял», — рэзюмаваў ён.**

### ПЕРСПЕКТЫВЫ. ВЫЗНАЧЫЦЬ ПРЫЯРЫТЭТЫ І «ЧЫРВОНЫЯ ЛІНІІ»

Прэзідэнт паставіў задачу — з улікам намечанага прагрэсу ў кантактах з Вашынгтонам неабходна выпрацаваць далейшы алгарытм беларуска-амерыканскіх адносін на перспектыву. «Пры гэтым мы павінны больш дакладна вызначыць свае прыярытэты. Важна ўстанавіць таксама (як у нас модна цяпер казаць) «чырвоныя лініі», пераход якіх для нас непрымальны.

**Абавязкова ўлічваць, каб нашы дзеянні ні ў якім разе не нанеслі шкоду не толькі беларуска-расійскім, але і беларуска-кітайскім адносінам, а таксама нашым абавязацельствам перад іншымі дружалюбнымі краінамі ў рамках удзелу Беларусі ў еўразійскіх інтэграцыйных аб'яднаннях. Гэта святое. Мы дамовіліся, мы падпісалі адпаведнае пагадненне — таму павінны дзейнічаць у гэтых рамках.**

Магчыма, нам неабходна выпрацаваць нейкі план нашых адносін з амерыканцамі і вырашэння тых пытанняў, якія будуць пастаўленыя намі і імі ў ходзе перагавораў. Замацаваць гэта на самым высокім узроўні», — удакладніў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт заклікаў удзельнікаў нарады ўнесці канкрэтныя прапановы, выказаць меркаванні з тым, каб, магчыма, у будучыні разгледзець гэта пытанне на пасяджэнні Савета Бяспекі. «Трэба каб гэтыя глабальныя пытанні, пра якія я сказаў, асабліва беларуска-амерыканскія адносіны, былі абмеркаваны больш шырокім колам і прыняты калектыўныя рашэнні», — рэзюмаваў кіраўнік дзяржавы.

# НАЦЫЯНАЛЬНЫМІ ІНТАРЭСАМІ»

у гэтай вельмі складанай сітуацыі, адносна чаго ідзе актыўны дыялог з амерыканскім бокам. Нашы саюзніцкія адносіны з Расіяй, нашы блізкія адносіны з Украінай дазваляюць казаць, што трэба было б паспрабаваць вырашыць дадзеную праблему з улікам нашага разумення гэтай гісторыі», — адзначыў Іван Тэртэль.

Абмяркоўваюцца і адносіны з нашымі суседзямі — Польшчай і Прыбалтыкай. «Не будзе вялікай таямніцай, што ў нас ёсць каналы адносін з нашымі партнёрамі. Дыялог вядзецца, у тым ліку і па лініі спецслужбаў. Разуменне паміж намі паволі наладжваецца. Мы абмяркоўваем вострыя пытанні і дзесьці выходзім на разуменне ўзаемных інтарэсаў. Наш узаемны інтарэс — стабільная сітуацыя ў рэгіёне, эканоміка, якая працуе, занятасць людзей, спакойнае жыццё нашых грамадзян з перспектывай на будучыню. Пазіцыя Прэзідэнта вядомая — суседзяў не выбіраюць, тым больш мы заўсёды з павагай ставіліся да суседзяў, якімі б яны ні былі, мы ніколі не ўмешваліся ў іх справы, заўсёды былі настроеныя на кампраміс», — падкрэсліў Іван Тэртэль. Ён расказаў, што на нарадзе была актуалізавана пазіцыя Беларусі і па дыялогу з амерыканскім бокам, і ў адносінах з суседзямі і партнёрамі, уключаючы Францыю і Германію. «Пазіцыя выпрацаваная, яна заснаваная на павазе да інтарэсаў нашых суседзяў і партнёраў з арыенцірам на нашы нацыянальныя інтарэсы і на тое, што нашы партнёры гэтак жа павінны ўлічваць нашы інтарэсы. Настрой і пазіцыя кіраўніка дзяржавы нязменная — адносіны не на канфрантацыю, а наадварот, на карысць нашых народаў. Кіраўніком дзяржавы пастаўленыя пэўныя задачы», — адзначыў кіраўнік КДБ. Ён расказаў, што ў службовых асоб розныя меркаванні на гэты конт, таму дыскусія была вострая. Але ў выніку адзіная пазіцыя выпрацавана і на ёй будзе заснаваная далейшая работа.

«Мы кіруемся толькі нацыянальнымі інтарэсамі ў дачыненні да адносін з усімі краінамі, з якімі мы ўзаемадзейнічаем. Гэта аб'ектыўная рэальнасць, такі свет. Абмяркоўваецца і бяспека, эканоміка», — рэзюмаваў Іван Тэртэль. Ён падкрэсліў, што ў ЗША ёсць пэўная эканамічная цікавасць да Беларусі, напрыклад, па пытаннях нашага ўнёску ў забеспячэнне харчовай бяспекі. Эканоміка застаецца на чале ўсяго, і гэта пытанне таксама на парадку дня беларуска-амерыканскага дыялогу.

Валерыя СЦЯЦКО.

# ЗДАРОЎЕ МАЦІ І ДЗІЦЯЦІ — НАЙВАЖНЕЙШЫ ПРЫЯРЫТЭТ

## Прэм'ер-міністр Беларусі Аляксандр Турчын уручыў дзяржузнагароды

У Дзень маці ў Палацы Рэспублікі было асабліва шматлюдна. Тут адбылася ўрачыстая цырымонія ўручэння дзяржаўных узнагарод. Адпаведныя распараджэнні і ўказы падпісаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. У спісе ўзнагароджаных — больш за 50 чалавек з усіх рэгіёнаў краіны. Павіншаваў іх і ўручыў узнагароды Прэм'ер-міністр Аляксандр Турчын.


Фота БелТА.

«Мне ўдвая прыемна ў гэтае свята ўручыць вам заслужаныя дзяржаўныя ўзнагароды. Таму што Дзень маці — гэта сімвал бясконцай любові, пяшчоты і клопату. Менавіта мама з'яўляецца крыніцай сілы і натхнення для свайго дзіцяці. Менавіта мама вучыць любіць Радзіму, быць сумленным і справядлівым, паважаць старэйшых і дапамагаць тым, хто мае патрэбу ў падтрымцы. Яе ўрокі і запаветы дапамагаюць нам у самыя адказныя і часам лёсавызначальныя моманты нашага жыцця».

Кіраўнік урада падкрэсліў, што падтрымка сем'яў з дзецьмі, здароўе маці і дзіцяці былі і застаюцца найважнейшымі прыярытэтамі сацыяльнай палітыкі нашай дзяржавы. «Ствараюцца камфортныя ўмовы для жыцця і выхавання дзяцей: будуецца жыллё, дзіцячыя сады і школы, медыцынскія ўстановы. Павышаецца якасць і даступнасць адукацыі, медыцынскай дапамогі, — адзначыў Аляксандр Турчын. — Сёння ў гэтай зале сабраліся мамы, якія дасягнулі значных вынікаў не толькі ў выхаванні дзяцей, але і ў прафесійнай дзейнасці ў розных галінах. Узорным служэннем справе вы паказваеце прыклад сваім дзецям».

Асаблівыя словы павагі і захаплення Прэм'ер-міністр Беларусі выказаў шматдзетным мамам. «Кожная з вас — сапраўдная гераіня! Маленькія беларусы растуць дзякуючы вашым надзейным рукам і дабрыні сэрцаў. Неацэнны ваш уклад ва ўмацаванне сямейных традыцый і выхаванне годных грамадзян краіны. Ад вашага клопату залежыць не толькі дабрабыт вашай сям'і і дзяцей, але і будучыня нашай краіны», — сказаў Аляксандр Турчын.

Кіраўнік урада павіншаваў жанчын са святам, пажадаў здароўя, дабрабыту ім і іх сем'ям: «Хачу пажадаць нам усім мірнага неба над галавой, — сказаў ён. — Каб мы як мага часцей збіраліся з такой нагоды».

За нараджэнне і выхаванне пяці і больш дзяцей ордэнам Маці была ўзнагароджана **настаўнік гісторыі і грамадазнаўства сярэдняй школы № 72 Гомеля Ганна ШКЛЯРАВА.** «Неацэнная тая падтрымка, якая адчуваецца не толькі ад нашых вялікіх сем'яў, але і на такім высокім узроўні, — адзначыла яна. — Упэўнена, кожны прыкладзе максімум намаганняў для развіцця нашай любімай Беларусі. Мацярынскі абавязак — выхаваць годных грамадзян краіны, прывіць любоў да Радзімы. Кожная сям'я ўнікальная. Гэта шэдэўр, які ствараем мы самі, а сям'я, у якой шмат дзяцей, — гэта залог нашай будучыні».

Ганна Шклярава — маці дваіх сыноў і трох дачок. Старэйшаму ўжо споўнілася 18 гадоў, вучыцца ў ВНУ, малодшая толькі пайшла ў дзіцячы сад. Паводле слоў гамяльчанкі, дапамога шматдзетным сем'ям у Беларусі аказваецца каласальная. Акрамя таго, што выплачваецца дапамога на догляд за дзіцем, на гурткі і секцыі дзеці могуць хадзіць бясплатна. Аказваецца падтрымка і ў падрыхтоўцы да школы. У многіх крамах прадастаўляецца зніжка. «Мае дзеці разумнікі, імі ганаруся. Добра вучацца, ведаюць, што без працы нічога не атрымліваецца. У спорце ёсць пэўныя дасягненні. Вельмі прыемна, што роля маці ацэньваецца так высока», — адзначыла Ганна Шклярава.

Медалём «За працоўныя заслугі» ўзнагароджана **намеснік старшыні Асіповіцкага райвыканкама Ганна ЗЕМЛЯНУХІНА.** «На дзяржаўнай службе ўжо больш за 25 гадоў, восем — узначальваю сацыяльную сферу раёна, — паведаміла яна. — Задачы, якія стаяць і ў адукацыі, і ў ахове здароўя, у культуры, спорце, у галіне сацыяльнай абароны, вельмі шматпланавыя — на варце інтарэсаў людзей. Вельмі адказная работа і добры калектыў, каманда, якая сёння робіць часам нават практычна немагчымае. Ганарымся тым, што за апошнія гады ў нас вельмі сур'ёзна ўмацавалася матэрыяльна-тэхнічная база сацыяльнай сферы. У канцы 2019-га пабудавалі новую бальніцу, летась — новую школу. Выканалі капітальныя рамонты школ, установы аховы здароўя. Гэта сапраўды дарагога варта. Самае важнае — удзячныя дзяржаве за тое, што наша праца адзначана такой высокай узнагародай. Гэта матывуе на новыя дасягненні».

Медаль Францыска Скарыны ўручаны **артыстцы балета Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусь імя Г. І. Цітовіча Ірыне ДАНІЛЮК.** У калектыве яна працуе з 1998 года. «Калі даведалася аб узнагароджанні, мяне перапаўнялі пачуцці гонару і радасці, — прызналася яна. — Мне як маме двух выдатных сыноў прыемна атрымаць узнагароду менавіта сёння. Прывыкла заўсёды працаваць, быць у рэсурсе, быць важнай, патрэбнай, запатрабаванай, перадаваць вопыт маладому пакаленню, укладваць, ствараць і ад гэтага атрымліваць задавальненне. Па сумяшчальніцтве працую рэпетытарам па балеце, таксама з'явілася новая сфера — пастаноўшчык нумароў. Не стаім на месцы, развіваемся, рухаемся наперад».

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

# НЕ ДАНІНА МОДЗЕ, А РЫСА НАШАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА ХАРАКТАРУ

## Шматдзетных маці ўшаноўвалі і віншавалі па ўсёй краіне



Фота БелТА.

У жыцці кожнага з нас мама — галоўны і самы блізкі чалавек. Яе любоў, клопат і вера патрэбныя нам у любым узросце — яны служаць апорай і арыенцірам у жыцці, саграваюць і надаюць сіл у цяжкія хвіліны. З нагоды свята карэспандэнты «Звязды» пацікавіліся, як ушаноўвалі шматдзетных маці ў рэгіёнах краіны.

Цырымонія ўзнагароджання шматдзетных жанчын Міншчыны адбылася ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы. Высокай дзяржузнагароды былі ўдастоены 26 жыхарак вобласці.

«У гэты святочны дзень мы аддаём даніну павагі і шчырай падзякі жанчынам, чые любоў, сіла і самаадданасць з'яўляюцца апорай сямейнага шчасця, — шматдзетным маці, — адзначыў **старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксей КУШНАРЭНКА.** — Кожная з вас — прыклад любові і клопату. Вы выхоўваеце не адно, а некалькі пакаленняў, укладваючы душу ў кожнае дзіця, фарміруючы адказных і годных грамадзян нашай краіны».

Прыбраныя, усмешлівыя і вельмі абаяльныя — каля 30 жанчын з усёй Магілёўскай вобласці прымалі віншаванні з Днём маці, тром з іх ва ўрачыстай абстаноўцы ўручылі ордэн Маці. Віншуючы жанчын са святам, **першы намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Сяргей САВІЦКІ** адзначыў, што для кожнага чалавека Дзень маці — асаблівая падзея, бо гэта даніна павагі самай дарагой жанчыне на свеце — маме.

Асаблівыя словы ўдзячнасці Сяргей Савіцкі выказаў тым жанчынам, чые дамы сталі роднымі для ўсыноўленых і ўзятых на выхаванне дзяцей. Іх шчаслівы дзіцячы смех — гэта будучыня краіны, упэўнены ён. Дарэчы, у Магілёўскай вобласці пражываюць больш за 12,5 тысячы шматдзетных сем'яў. За 9 месяцаў 2025 года нарадзілася каля 4,5 тысячы дзяцей. 711 сем'ям рэгіёну прызначаны мацярынскі капітал. Сёлета 71 жыхарка Магілёўскай вобласці ўдастоена ордэна Маці.

На ўрачыстым прыёме ў абласным цэнтры 14 прадстаўніц Гомельшчыны ўзнагародзілі ордэнам Маці. Са святам жыхарак вобласці павіншаваў **старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван КРУПКО:** «Дзіцячае шчасце пачынаецца з бацькоўскага поспеху. Сэрца маці, якая любіць, і надзейнае моцнае плячо бацькі служаць душэўнай прыстанню і апорай на працягу ўсяго нашага жыцця. Невыпадкова па прапанове нашага Прэзідэнта 21 кастрычніка адзначаецца Дзень бацькі, а паміж Днём бацькі і гэтай датай беларусы адзначаюць Тыдзень бацькоўскай любові. Гэта час, калі асабліва важна прамовіць простыя, але такія неабходныя словы: «Дзякуй, мама! Дзякуй, тата!»

Як нагадаў кіраўнік рэгіёна, на Гомельшчыне з кожным годам расце колькасць шматдзетных сем'яў — сёння ў нас іх 19 тысяч.

Урачысты прыём жанчынам, якія годна нясуць высокі статус маці, зладзілі і на Віцебшчыне. Уручаючы ўзнагароды, **старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН** паведаміў, што каля 7 тысяч жанчын з паўночнага рэгіёна штогод нараджаюць дзяцей: «Мы сёння ўшаноўвалі шматдзетныя сем'і, якіх на тэрыторыі толькі нашай вобласці больш за 12 тысяч. За іх плячыма — велізарная праца! Напэўна, гэта і ёсць працоўны подзвіг, які складана апісаць і цяжка ўявіць тым, хто гэтым не займаўся. Таму ім вялікі дзякуй, цярпення і здароўя. Няхай усё атрымліваецца і дома, і на працы, — пажадаў губернатар Віцебшчыны. — У нас традыцыйна каля 7 тысяч мам штогод становяцца ў чарговы раз маці, з іх каля сотні нараджаюць двайнят. І гэта выдатна. Сёлета 37 ордэнаў Маці атрымалі жанчыны Віцебшчыны. А ў цэлым іх ужо 1145».

У Гродзенскай вобласці Тыдзень бацькоўскай любові стартаваў з урачыстага прыёму сем'яў з усіх раёнаў у палацава-паркавым комплексе «Вялікі Свяцк Валовічаў». Героямі свята сталі шматдзетныя бацькі, пераможцы творчых, спартыўных і іншых конкурсаў, тыя, чые дзеці дасягнулі значных поспехаў у розных сферах — працоўнай, навуковай, грамадскай. **Памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гродзенскай вобласці Канстанцін БУРАК** уручыў жанчынам ордэны Маці. А на Брэстчыне жыхары Пружан атрымалі ў падарунак будынак жаночай кансультацыі і педыятрычнае аддзяленне паліклінікі.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ, Наталля КАПРЫЛЕНКА, Святлана ЯКАЎЛЕВА.**

# ПА ВЫСОКІМ СТАНДАРЦЫ

Якасць тавараў і паслуг — тое, чым мы сапраўды можам ганарыцца. Як унутры краіны, так і далёка за яе межамі ведаюць, што «Зроблена ў Беларусі» — сведчанне гарантавана высокага ўзроўню. Прыярытэтныя мэты аб'ўленай Прэзідэнтам пяцігодкі якасці — далейшае павышэнне якасці жыцця людзей, канкурэнтаздольнасці беларускай эканомікі, удасканаленне грамадскіх адносін. А ў аснове якасці і канкурэнтаздольнасці прадукцыі і паслуг ляжаць стандарты. Чым больш прагрэсіўны ўзровень іх патрабаванняў, тым, адпаведна, лепшая якасць. Стандарты аказваюць значнае станоўчае эканамічнае ўздзеянне, стымулююць распрацоўку новай прадукцыі і ўдасканаленне існуючай, спрыяючы развіццю рынку і паляпшэнню ўмоў паставак.



## ФОНД ДЗЕЮЧЫХ У КРАІНЕ ДЗЯРЖСТАНДАРТАЎ — КАЛЯ 32 ТЫСЯЧ ДАКУМЕНТАЎ

«Стандарты — гэта інструмент даверу, — адзначае **старшыня Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Алена МАРГУНОВА.** — Гэта патрабаванні, з якіх пачынаецца распрацоўка нечага новага або ажыццяўляецца ўдасканаленне таго, што ёсць. Калі ўзяць 2025 год, то ў Беларусі ўжо прынята 444 стандарты».

Яны датычацца транспарту, будаўніцтва, у тым ліку дарожнага, машынабудавання, электратэхнікі, робататэхнікі, мэблі, лёгкай, харчовай прамысловасці, сувязі, паслуг, сістэм беражлівай вытворчасці і іншых. Узровень іх гарманізацыі з міжнароднымі і рэгіянальнымі склаў 64 %.

«У Беларусі ідзе акцэнт на стварэнне ў большай ступені менавіта міждзяржаўных стандартаў, гарманізаваных па ўсіх перадавых нормах для таго, каб наша прадукцыя безбар'ерна ішла на рынкі іншых краін без абмежаванняў і выключэнняў. Чым больш актыўна нашы прадпрыемствы будуць удзельнічаць у распрацоўцы стандартаў і закладваць тыя патрабаванні, якія ім выгадныя, якія дазволяць выпускаць канкурэнтаздольную, бяспечную, якасную прадукцыю, тым больш у нас будзе магчымасць асвойваць новыя рынкі. Сёння наша прадукцыя ідзе ў 161 краіну», — расказала старшыня Дзяржстандарту.

Акрамя таго, актыўна развіваецца і нацыянальная стандартызацыя. У прыватнасці, распрацавана праграма стратэгічнага развіцця тэхнічнага рэгулявання Беларусі да 2030 года, у якой дакладна прапісаны асноўныя пастулаты. Па-першае, узрост стандартаў не павінен перавышаць пяць гадоў. Па-другое, пры распрацоўцы стандартаў абавязковы ўдзел усіх зацікаўленых: вытворцаў, бізнесу, органаў дзяржкіравання. Усё гэта робіцца для дасягнення кансэнсусу ў стварэнні і распрацоўцы патрабаванняў, якія закладваюцца ў стандарты.

Варта адзначыць, што яны з'яўляюцца добраахвотнай сферай. Улічваючы, што наша краіна з'яўляецца часткай розных інтэграцыйных утварэнняў — гэта Саюзная дзяржава, ЕАЭС, СНД — стандартам адведзена роля даверу. Калі вытворца ўказвае ў маркіроўцы адпаведнасць стандарту, ён абавязвае сябе выканаць яго патрабаванні.

## АБ ПЛАНАХ НА ПЯЦІГОДКУ ЯКАСЦІ

Важным застаецца абарона ўнутранага рынку інструментамі стандартызацыі, метралогіі, акрэдытацыі ад небяспечнай і фальсіфікаванай прадукцыі.

Як адзначыла Алена Маргунова, за першае паўгоддзе праведзена прыкладна 40 тысяч кантрольна-наглядных мерапрыемстваў і каля 700 тавараў прызнаныя небяспечнай прадукцыяй. У прыватнасці, гэта прадукты імпартнай вытворчасці — каля 85 %. Вядома ж, сочаць і за нашымі айчыннымі таварамі, але ў нас працэнт выяўлення небяспечнай прадукцыі складае прыкладна 0,5-0,6 %.

«Акрамя таго, будзем займацца бесперашкодным прасоўваннем нашай прадукцыі на рынкі іншых краін з дапамогай апераджальнай стандартызацыі, укараняць новыя стандарты, патрэбныя спажыўцу. Яшчэ адзін элемент — лічбавізацыя механізмаў тэхнічнага рэгулявання для таго, каб адсочваць не толькі бяспеку, але і якасць тавару, пачынаючы з «поля» і заканчваючы гатовай прадукцыяй. Варта таксама ўкараняць перадавыя практыкі, якія зарэкамендавалі сябе са станоўчага боку ў рамках сістэм менеджменту — якасці, харчовай бяспекі, аховы працы, беражлівай вытворчасці. Усе гэтыя сістэмы дапамогуць інструментам якасці ствараць бяспечную канкурэнтаздольную прадукцыю з найменшымі выдаткамі», — акрэсліла планы на бліжэйшы час старшыня Дзяржстандарту.



Інжынер 1-й катэгорыі выпрабавальнага цэнтра БелДІСС Аляксандра ГЕРАСІМАВА праводзіць выпрабаванні мабільнага тэлефона па параметрах сувязі.



Малады спецыяліст, тэхнік выпрабавальнага цэнтра БелДІСС Андрэй РАМАНАЎ наладжвае абсталяванне для відэафіксацыі выпрабаванняў прадукцыі па электрамагнітнай сумяшчальнасці.

**Кіраўнік Прадстаўніцтва Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы ў Мінску Анатоль МАРКЕВІЧ** адзначыў, што наша краіна на працягу стагоддзя не разгубіла, а захавала і прымножыла дасягненні ў галіне стандартызацыі: «У Беларусі стандартызацыя — нацыянальны стрыжань і аснова якасці. Менавіта дзякуючы высокім стандартам нашу прадукцыю любіць як блізкае, так і далёкае замежжа. Наша дзяржава працягвае супрацоўніцтва ў галіне стандартаў якасці на міжнародных пляцоўках. Не выпадкова, што ў рамках Саюзнай дзяржавы гэта пытанне выходзіць на новы ўзровень. Збліжэнне эканомік нашых краін, работа па гарманізацыі заканадаўства ў галіне падаткаабкладання, працоўных адносін, сацыяльных гарантый, распрацоўка і ўзгадненне адзінай прамысловай палітыкі, глыбокая кааперацыя дазваляюць гаварыць аб прадукцыі сумеснай вытворчасці».

Паводле яго слоў, пытанні якасці прадукцыі Беларусі і Расіі ва ўмовах недружалюбных паводзін трэціх краін, увядзення санкцый у дачыненні да дзвюх нашых дзяржаў набываюць стратэгічнае значэнне і з'яўляюцца асновай для забеспячэння тэхналагічнага, харчовага суверэнітэту, развіцця экспарту.

**Яна ВАЛАСАЧ.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**


БЕЛАРУСБАНК

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже недвижимого имущества – ОАО «АСБ Беларусбанк» (Гомельское областное управление № 300)**

**ЛОТ 1:** наименование объекта продажи –

**капитальное строение с составными частями и принадлежностями,**
инвентарный номер 350/С-78756,
общей площадью 2036,3 м$^2$,

расположенное по адресу:
**Гомельская область, г. Гомель, ул. Жукова, 40а.**

Начальная цена продажи составляет 1 778 272,25 рубля (один миллион семьсот семьдесят два белорусских рубля 25 копеек), в том числе НДС по ставке 20 % – 296 378,71 рубля (двести девяносто шесть тысяч триста семьдесят восемь белорусских рублей 71 копейка).

Сумма задатка – 1 000,00 рубля (одна тысяча рублей 00 копеек).

Победителем аукциона оплачивается имущество, относящееся к объекту недвижимости, согласно приложению № 2 на общую сумму 10 677,40 (десять тысяч шестьсот семьдесят семь рублей 40 копеек) с учетом НДС по ставке 20 %.

**Открытый аукцион состоится 18.11.2025 в 11.00 часов по адресу: г. Гомель, ул. Фрунзе, 6а, актовый зал (помещение на четвертом этаже).**

Заявление на участие принимается в рабочие дни **с 9.00 до 16.30, в пятницу – до 15.30 по 17.11.2025 включительно** по адресу: г. Гомель, ул. Фрунзе, 6а (каб. 113).

По вопросам, связанным с объектами продажи, обращаться по телефонам: (0232) 50-92-25, (8029) 180-88-05 – Ладыженко Светлана Станиславовна.

Продавец – ОАО «АСБ Беларусбанк». Договор купли-продажи заключается с ОАО «АСБ Беларусбанк» и регистрируется в органе по государственной регистрации по месту нахождения объекта.

Для участия в открытом аукционе предоставляется заявление, к которому прилагается документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка по 17.11.2025 включительно на счет № BY69AKBB66708597000020000000 БИК AKBBBY2X в ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 100325912.

К заявлению также прилагаются:

юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию;

иностранным юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

представителем юридического или физического лица – доверенность (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель). Доверенность от имени нерезидента Республики Беларусь должна быть легализована в установленном законодательством порядке, перевод на белорусский или русский язык нотариально заверен.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий полномочия (приказ о назначении на должность, или выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

При подаче заявления организатором открытого аукциона с участниками заключается соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены с учетом НДС. Победителем открытого аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Победителем аукциона возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения торгов в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты его проведения.

Договор купли-продажи по результатам проведения аукциона должен быть подписан в течение 30 рабочих дней со дня проведения открытого аукциона.

Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи и документацией на объекты



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО КОНКУРСА

1. Дата, время проведения торгов – **15.11.2025 г. в 13.00.**
2. Предмет торгов:

**право на заключение договора купли-продажи однокомнатной квартиры с инв. № 500/D-316433, расположенной по адресу: г. Минск, ул. Широкая, д. 26, кв. 48.**

3. Начальная цена (сумма в белорусских рублях, эквивалентная) – 55000 долларов США по курсу НБ РБ на день проведения торгов.
4. Общая площадь квартиры – 32,68 кв. м.
5. Конкурсное обеспечение/конкурсный сбор – 1513,23/2017,64 бел. руб.
6. Срок передачи объекта/срок снятия с регистрационного учёта – до сделки.
7. Дата, время начала приема заявок/дата, время окончания приема заявок – **15.10.2025 г. в 11.00/15.11.2025 г. в 13.00.**
8. Срок возможного отказа от проведения торгов – **15.11.2025 г. в 13.00.**
9. Срок заключения договора купли-продажи объекта после проведения торгов (в рабочих днях) – не более 20.
10. Форма и сроки расчета за объект (в календарных днях) с момента заключения договора купли-продажи – наличные в день заключения договора и/или использование кредитных средств.
11. Иные условия проведения торгов: Победитель торгов определяется в соответствии с Правилами организации и проведения торгов, в форме конкурса ООО «Центростиль Эстейт», утвержденными приказом директора от 25.08.2025 г. № 6 (далее – Правила). К участию в торгах допускаются лица (далее – Участники), внесшие конкурсное обеспечение, подавшие заявки на участие в торгах и предложения. Проведение торгов, подача заявок на участие в торгах, предложений происходит по адресу: г. Минск, ул. Орловская, д. 40А, комн. 11/13. Для участия в торгах Участники представляют Организатору документ об уплате конкурсного обеспечения, а также документы согласно п.п. 4.2. – 4.6. Правил. Конкурсный сбор, в порядке возмещения затрат на организацию и проведение торгов, в форме конкурса оплачивается Победителем торгов (единственным Участником) в день подписания протокола торгов. Конкурсное обеспечение, конкурсный сбор перечисляется на р/с BY95ALFA30122H65370010270000 в ЗАО «АЛЬФА БАНК» г. Минск, БИК банка: ALFABY2X или в кассу Организатора, по адресу: г. Минск, ул. Орловская, д. 40А, комн. 11/13. Организатор ООО «Центростиль Эстейт» г. Минск, ул. Орловская, д. 40А, комн. 11/13. Тел. +375296772048

**РУП «Торговый дом «Восточный»**

извещает о проведении 18.11.2025 открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества

**Лот № 1.** Часть капитального строения с инвентарным номером 100/С-9034 (Литер Б2/к), расположенного на первом этаже по адресу: Брестская область, г. Брест, ул. Мицкевича, д. 36, площадью 350,91 кв. м, а именно: кабинет заведующей (4) – 9,2 кв. м, подсобка (7) – 26,2 кв. м, компрессорная (8) – 10,5 кв. м, холодильная камера (9) – 6,2 кв. м, холодильная камера (10) – 4,8 кв. м, холодильная камера (11) – 5,9 кв. м, подсобка (12) – 11,2 кв. м, коридор (21) – 10,6 кв. м, торговый зал (22) – 174,4 кв. м, часть коридора (23) – 54,61 кв. м, подсобка (25) – 13,1 кв. м, подсобка (26) – 9,8 кв. м, подсобка (28) – 7,2 кв. м, тамбур (33) – 2,5 кв. м, тамбур (33а) – 4,7 кв. м, для осуществления розничной торговли. Арендная плата в месяц составляет **365,13900 БАВ** или **6 853,66 руб.**
Начальная цена продажи права заключения договора аренды недвижимого имущества – 1 646,65 руб.
Задаток по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества – 164,66 руб. Шаг аукциона – 5 %

**УСЛОВИЯ**

1. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение.
2. На Победителя аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для победителя аукциона. Организация и проведение аукциона осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.
3. Порядок проведения аукциона, в том числе об оформлении участия в аукционе, указан на сайте konfiskat.by в разделе «Аренда».
4. Извещение о проведении торгов размещено на сайтах: организатора торгов – https://konfiskat.by (раздел «Аукционы/Недвижимость/Аукцион на право заключения договора»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – www.gki.gov.by (раздел «Продажа/Аренда имущества»)

**Аукцион состоится 18.11.2025 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 27, актовый зал**

**Организатор аукциона:** РУП «Торговый дом «Восточный», 220125, г. Минск, ул. Уручская, 14А.
Заявление на участие с приложением необходимых документов, в том числе документа, подтверждающего внесение суммы задатка (задатков) **с отметкой банка**, принимаются по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 27 в рабочие дни: пн. – чт. – с 09.00 до 13.00, с 14.00 до 17.00, пт. – с 09.00 до 13.00, с 14.00 до 15.00. **Окончание приема заявлений – 13.11.2025 в 15.00.**
Задаток перечисляется на расчетный банковский счет Организатора аукциона: р/с BY53 AKBB 3012 0134 7111 1530 0000, БИК AKBBBY2X, ОАО «АСБ Беларусбанк» ЦБУ № 514, г. Минск, ул. Сурганова, 47а, получатель – РУП «Торговый дом «Восточный», УНП 101127633, ОКПО 37411910. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже права заключения договора аренды, проводимом **18 ноября 2025 года.**
**Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона, о чем организатор аукциона обязан уведомить лиц, подавших заявление на участие в нем**

**Контакты организатора аукциона: +375 44 763 62 63; +375 17 275 75 12**



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191224638. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ООО «ДЭНСИБЕЛ», 220091, г. Минск, ул. Матусевича, 33/2-3, офис 2. УНП 190276142 |

| № лота | Предмет электронных торгов | Начальная цена лота, с НДС 20 % |
|---|---|---|
| 1 | **Автомобиль грузовой цистерна FORD V8**, р/зн. ВА 1961-7, 1985 г. в. | 36 000,00 долл. США* |
| 2 | **Фильтровальная установка фирмы LTG** для удаления отходов и запыленного воздуха от ткацких станков, инв. № 00000221 | 118 800,00 бел. руб. |

**Местонахождение – г. Минск, ул. Матусевича, 33**

** Расчет по договору купли-продажи будет производиться в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату проведения платежа*

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB 30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 5 (пять) рабочих дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **6 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 26.06.2025 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**: **06.11.2025 г. с 11.00 до 13.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **05.11.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by.

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |


АКЦЭНТЫ

# ВАЖКАЯ ПАДТРЫМКА

**На якую сацыяльную абарону ад дзяржавы могуць разлічваць сем'і з дзецьмі?**

Падтрымка сем'яў з дзецьмі — нацыянальны прыярытэт. Згодна з Канстытуцыяй нашай краіны шлюб, сям'я, мацярынства, бацькоўства і дзяцінства знаходзяцца пад абаронай дзяржавы. Пра тое, што ўсталяваныя на дзяржаўным узроўні святы — Дзень маці (14 кастрычніка) і Дзень бацькі (21 кастрычніка) — суправаджаюцца не толькі прыгожымі словамі, а яшчэ і рэальнымі справамі і адпаведнай дапамогай, падрабязна расказалі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны насельніцтва.

## ОРДЭН ЗА МАЦЯРЫНСКІ КЛОПАТ І САМААДДАЧУ

Мацярынства адзначаецца высокай дзяржаўнай узнагародай — ордэнам Маці. Сёлета яго ўдастоены **458** жанчын, якія выхоўваюць пяць і больш дзяцей, сваім асабістым прыкладам з'яўляючыся для грамадства ўзорам мацярынскага клопату і самааддачы.

Дарэчы, да ордэна дадаецца аднаразовая грашовая выплата ў памеры пяці бюджэтаў пражытачнага мінімуму (**2 438,60** рубля).

З 1996 года ордэнам Маці ўзнагароджаны **14,3** тысячы жанчын.

## ПАДТРЫМКА ШМАТДЗЕТНЫХ

Важным момантам з'яўляецца падтрымка шматдзетных сем'яў. У прыватнасці, сямейны капітал, які прызначаецца пры нараджэнні, усынаўленні трэцяга або наступнага дзіцяці.

Так, з 1 студзеня 2025-га памер сямейнага капіталу складае **33 275** рублёў. На яго сёлета ў рэспубліканскім бюджэце прадугледжана больш за 360 мільёнаў рублёў.

Дарэчы, у Беларусбанку за ўвесь перыяд рэалізацыі праграмы (з 2015 года) адкрыта **149,3** тысячы ўкладаў «Сямейны капітал», на якія залічана 826,7 мільёна долараў ЗША і амаль 1,8 мільярда рублёў.


Фота БелТА.

У Мінпрацы растлумачылі, што шматдзетныя сем'і маюць права датэрмінова выкарыстоўваць сродкі сямейнага капіталу на будаўніцтва (рэканструкцыю), набыццё жылля, пагашэнне крэдытаў; атрыманне адукацыі ў дзяржаўных установах адукацыі; атрыманне медыцынскіх паслуг, якія аказваюцца дзяржаўнымі арганізацыямі аховы здароўя; набыццё тавараў для сацыяльнай рэабілітацыі і адаптацыі членаў сям'і з інваліднасцю ў сувязі з захворваннямі апорна-рухальнага апарату, органаў зроку.

У ведамстве дадалі, што па стане на 1 кастрычніка 2025-га прынята **96,3** тысячы рашэнняў (за ўвесь перыяд рэалізацыі з 2020 года) аб датэрміновым распараджэнні сямейным капіталам, з іх **77 %** — на рашэнне жыллёвых пытанняў сям'і, **14 %** — на атрыманне адукацыі, **9 %** — на медыцынскія паслугі.

## НА ШТО МОГУЦЬ РАЗЛІЧВАЦЬ СЕМ'І З ДЗЕЦЬМІ?

Як растлумачылі ў профільным міністэрстве, сацыяльная абарона сям'і, мацярынства і бацькоўства забяспечваецца праз прадастаўленне дзяржаўных дапамог пры нараджэнні і выхаванні дзяцей; сямейнага капіталу пры нараджэнні трэцяга або наступнага дзіцяці; адраснай сацыяльнай дапамогі і сацыяльных паслуг; гарантый у сферы працы, пенсіённага забеспячэння, жыллёва-крэдытных адносін і ў іншых сферах жыццядзейнасці сям'і.

Раскажам пра некаторыя з іх. Напрыклад, у 2025 годзе на сістэму дзяржаўных дапамог выдзелена **3,7** мільярда рублёў, з іх амаль **2** мільярды — на выплату дапамог па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў. Такімі выплатамі ахоплена больш за **340** тысяч дзяцей.

Пры нараджэнні дзіцяці памер аднаразовай дапамогі сям'і складзе 10 бюджэтаў пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва (з 1 жніўня 2025-га — 4,8 тысячы рублёў), пры нараджэнні другога і наступных дзяцей — 14 БПМ (6,8 тысячы рублёў).

Затым сям'я штомесяц будзе атрымліваць дапамогу па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў. Пра якую суму ідзе гаворка? На першае дзіця — **35 %** ад сярэдняй заработнай платы работнікаў у краіне за квартал (**931,9** рубля), на другога і наступных дзяцей — **40 %** СЗП (**1 065** рублёў), на дзіця-інваліда — **45 %** СЗП (**1 198,2** рубля).

Пры выхаванні ў сям'і дваіх і больш дзяцей, адзін з якіх ва ўзросце да трох гадоў, выплачваюцца дзве дапамогі: на дзіця да трох гадоў (**40 %** СЗП) і дзіця (дзяцей) ад трох да 18 гадоў (**50 %** БПМ). Сумарны памер двух дапамог у маі складаў **1 308,9** рубля.

Пры нараджэнні двайнят (трайнят і больш дзяцей) устаноўлена дадатковая аднаразовая выплата на набыццё дзіцячых рэчаў першай неабходнасці — па 2 БПМ на кожнае дзіця, якое нарадзілася (або па 975,4 рубля).

## ПЛЮС ЭКАНОМІЯ СЯМЕЙНАГА БЮДЖЭТУ

**Акрамя названых вышэй адраснай сацыяльнай дапамогі і сацыяльнага абслугоўвання можна весці гаворку і аб падтрымцы сем'яў з дзецьмі пры вырашэнні імі жыллёвага пытання.**

Так, ільготны крэдыт на жыллё выдаецца маладой сям'і з двума дзецьмі пад **5 %** гадавых на 20 гадоў, шматдзетнай сям'і — пад **1 %** гадавых на 40 гадоў. Пры гэтым дзяржава прадастаўляе фінансавую дапамогу ў пагашэнні запазычанасці па льготных крэдытах.

Маладым сем'ям пры нараджэнні першага дзіцяці фінансавая дапамога прадастаўляецца ў памеры **10 %** ад сумы запазычанасці па льготным крэдыце, у памеры **20 %** — пры нараджэнні другога дзіцяці.

Для сем'яў з трыма дзецьмі дзяржава пагашае **75 %** ад сумы запазычанасці, для сем'яў з чатырма і больш дзецьмі сума запазычанасці цалкам пагашаецца дзяржавай.

Дарэчы, толькі летась **5,6** тысячы маладых сем'яў і **7,8** тысячы шматдзетных сем'яў палепшылі свае жыллёвыя ўмовы.

Акрамя таго, ёсць і дадатковыя гарантыі.

Напрыклад, для сем'яў з двума дзецьмі, якія наведваюць дзіцячы садок, бацькоўская плата зніжана на **30 %**, для шматдзетных сем'яў — на **50 %**, сем'і, якія выхоўваюць дзіця з інваліднасцю, вызвалены ад такой платы зусім.

— Бясплатная адукацыя ў школах для ўсіх дзяцей (а ў першых трох класах і бясплатнае харчаванне), ільготнае карыстанне падручнікамі і навучальнымі дапаможнікамі, бясплатнае транспартнае забеспячэнне дзяцей, прадастаўленне крэдыту на льготных умовах для аплаты першай вышэйшай адукацыі, стыпендыі і іншыя грашовыя выплаты, бясплатнае і льготнае прадастаўленне лекавых сродкаў дзецям да трох гадоў і дзецям-інвалідам да 18 гадоў, бясплатнае санаторна-курортнае лячэнне дзяцей, ільготы бацькам у сферы падаткаабкладання — усе гэтыя меры субсідзіруюцца дзяржавай і значна эканомяць бюджэт сям'і, — падагульнілі ў Мінпрацы.

Мясцовае Самакіраванне
Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
15 кастрычніка 2025 г. № 38 (819)

# АБ СПРАДВЕЧНЫХ КАШТОЎНАСЦЯХ

**Тыдзень бацькоўскай любові ў абедзвюх палатах парламента адзначаны цікавымі мерапрыемствамі**

## МОЦНАЯ СЯМ'Я — АСНОВА МОЦНАЙ ДЗЯРЖАВЫ

**Члены Савета Рэспублікі правялі прамыя тэлефонныя лініі, абмеркаваўшы актуальныя пытанні сямейнай палітыкі**

У мерапрыемстве былі задзейнічаны практычна ўсе сенатары, якія працавалі ў розных рэгіёнах краіны. Зададзеная тэма не выпадковая: тэлефонныя лініі прайшлі напярэдадні маштабнага форуму «Размова аб важным: шчаслівая сям'я — моцная дзяржава», асноўныя мерапрыемствы якога пройдуць у Полацку сёння. Гэта сумесная ініцыятыва Савета Рэспублікі і Беларускай праваслаўнай царквы, якая прысвечана ўмацаванню статусу сям'і і папулярызацыі традыцыйных каштоўнасцяў як неад'емнай умовы захавання суверэнітэту, забеспячэння далейшага ўстойлівага развіцця і працвітання Беларусі. Такая размова з грамадзянамі дазволіла вызначыць найбольш актуальныя праблемы, якія іх хвалююць, каб абмеркаваць на форуме.

### ЗАМЕСТ ПАРКОВАК — ДЗІЦЯЧЫЯ ПЛЯЦОЎКІ

У дзень правядзення прамой тэлефоннай лініі па пытаннях сямейнай палітыкі і ўдасканалення заканадаўства ў сферы шлюбу і сям'і па ўсёй краіне былі даступныя 57 нумароў. І званкі паступалі практычна без перапынку. Людзі не толькі дзяліліся сваімі праблемамі з сенатарамі, але і агучвалі прапановы. Па шырокім спектры пытанняў грамадзяне з розных рэгіёнаў краіны звярталіся да Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай. Так, жыхары сталічнага мікрараёна Лошыца заклапочаны будаўніцтвам паркоўкі паміж шматкватэрнымі дамамі. Паводле слоў заяўнікаў, на пустыры планавалі пабудаваць дзіцячы садок, потым адмовіліся ад гэтага рашэння. Цяпер там маюць намер уладкаваць паркоўку. Між тым у дамах, якія і будаваліся для шматдзетных сем'яў, шмат дзяцей, а дзіцячых горак з арэлямі недастаткова. Бацькі запэўніваюць, што парковачных месцаў у акрузе хапае, і просяць садзейнічання ў будаўніцтве, напрыклад, стадыёна.

Узнімалася тэма, звязаная з удасканаленнем аказання дапамогі сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў. Адна з грамадзянак прасіла аказаць садзейнічанне ў стварэнні дадатковых спецыялізаваных груп у дзіцячых садках для дзяцей з асаблівасцямі маўлення.

### «МАЛАДАЯ СЯМ'Я» — ДА 35 ГАДОЎ

Не сакрэт, што беларусы сталі ўступаць у шлюб у больш усвядомленым узросце. Таму трапіць у разрад «маладая сям'я» паспяваюць не ўсе. Прагучала прапанова, якую парламентарыі абяцаюць разгледзець. Як адзначыла **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Наталля ГЛІНСКАЯ**, на дадзены момант сям'я, дзе аднаму з сужэнцаў да 31 года, мае магчымасць скарыстацца льготным крэдытаваннем для таго, каб пабудаваць уласнае жыллё. «Прапануецца павысіць узрост да 33, а можа быць, нават і да 35 гадоў. Думаю, што мы перададзім у адпаведную камісію гэту прапанову, яна будзе разгледжана».

### «ДЗЕЦІ Ў ЛЮБЫМ ВЫПАДКУ НЕ ПАВІННЫ ПАКУТАВАЦЬ»

Звярталіся з рознымі пытаннямі і да **старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Міхаіла РУСАГА.** «Любы камунікат у любы час, у любым фармаце, з любой катэгорыяй грамадзян вельмі важны і для нас, заканадаўцаў, і для ўлады, і для людзей, — адзначыў ён. — Такім чынам мы атрымліваем магчымасці дапамагчы людзям вырашыць тыя ці іншыя пытанні, ліквідаваць прабелы ў заканадаўстве».

Актуальныя пытанні, якія хвалююць многіх, датычацца аліментаў. «Бывае так, што бацька заплаціў нейкі мінімум, і ў выніку маці яго дзяцей звяртаецца па дапамогу да дзяржавы, таму што не мае нават бюджэту пражытачнага мінімуму на кожнага члена сям'і, — прыводзіць прыклад Міхаіл Русы. — Гэта тэма знаходзіцца на асаблівым кантролі Старшыні Савета Рэспублікі. Падключаем Мінпрацы і Мінюст, каб яны дапамаглі прымусіць нядбайнага бацьку або маці выконваць свае абавязацельствы. Дзеці ў любым выпадку не павінны пакутаваць». Сенатар падкрэсліў, што няма, бадай, у свеце яшчэ адной краіны, дзе такая ж магутная падтрымка сям'і, як у Беларусі.


Фота БелТА.

## МІСІЯ — ЛЮБІЦЬ ДЗЯЦЕЙ

**У Палаце прадстаўнікоў адбылася сустрэча з выхаванцамі прыёмных сем'яў і іх бацькамі-выхавацелямі**

Дзяржава ўдзяляе сур'ёзную ўвагу дзецям, якія трапілі ў складаную жыццёвую сітуацыю. Ініцыятыва стварэння дзіцячых дамоў сямейнага тыпу, што стала формай прафесійнага сямейнага клопату аб непаўналетніх, якія засталіся без апекі бацькоў, прыжылася і дае немалы плён. Хлопцы і дзяўчаты выхоўваюцца ў дамашняй абстаноўцы, у атмасферы даверу, цеплыні і любові — і ў выніку становяцца годнымі грамадзянамі сваёй краіны.

Гэта пацвердзіла і сустрэча ў Палаце прадстаўнікоў, прымеркаваная да Тыдня бацькоўскай любові. Дзеці, якія па розных абставінах былі пазбаўлены сям'і, сёння з'яўляюцца студэнтамі і курсантамі вядучых ВНУ краіны. І ўсё дзякуючы тым, хто ў свой час падставіў ім плячо дапамогі, атуліў клопатам і любоўю.

### З КЛОПАТАМ І ПАДТРЫМКАЙ

За неацэнную працу, бязмежную любоў і добрасумленнае выкананне бацькоўскіх абавязкаў **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА** уручыў прыёмным бацькам падзячныя лісты. У розны час у гэтых сем'ях выхоўваліся і працягваюць выхоўвацца і па 27, і па 33, і нават па 42 дзіцяці.

Спікер нагадаў, што ў свой час Прэзідэнтам была пастаўлена задача — зменшыць колькасць дзіцячых дамоў у іх класічным разуменні, увогуле з іх знікненнем у перспектыве. «У гэтым кірунку і пабудавана ўся наша сацыяльная палітыка, — звярнуў увагу Старшыня Палаты прадстаўнікоў. — Колькасць дзіцячых дамоў зменшылася ў чатыры разы».

Ідэя стварэння дзіцячых дамоў сямейнага тыпу належыць Беларускаму дзіцячаму фонду. Ігар Сергеенка падкрэсліў, што без любові да дзяцей, да прафесіі, сваёй справы не было б такіх вынікаў: «Толькі ў рамках праграмы «Цёплы дом» звыш 1500 дзяцей-сірот прайшло школу выхавання ў 43 дамах сямейнага тыпу, якія былі створаны з дапамогай вашай арганізацыі». Звяртаючыся да бацькоў-выхавацеляў, ён падкрэсліў, што дзякуючы ім дзеці атрымліваюць дамашнюю ўтульнасць, сардэчную атмасферу і цеплыню сямейных адносін.

### «УСЁ РАБЛЮ ДЛЯ ТАГО, КАБ ЯНЫ БЫЛІ ШЧАСЛІВЫЯ»

**Таццяна ЯКАВУК** з'яўляецца маці-выхавацелем дзіцячага дома сямейнага тыпу ў аграгарадку Турна Вялікая Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці. За час, які жанчына прысвяціла гэтай высакароднай справе, яна стала мамай для 27 дзяцей. Прытым што яшчэ дваіх дзяцей яна нарадзіла сама. Нягледзячы на тое што некаторыя прыёмныя дзеці ўжо працуюць, вучацца, у вольны час яны прыязджаюць у дзіцячы дом сямейнага тыпу, які стаў для іх бацькоўскай хатай, да мамы, якая застанецца ёй назаўсёды.

«Калі на вялікія святы ўсе збіраемся разам, нас атрымліваецца 30 чалавек, а часам і больш, — расказвае жанчына. — Я цалкам шчаслівая: столькі любові і цеплыні адчуваю ад сваіх дзяцей. З усімі ў мяне цудоўныя адносіны. Самыя дарагія і любімыя госці — гэта мае дзеці».

На такі адказны крок — стварыць вялікую сям'ю — Таццяна Якавук вырашылася, калі яе родная дачка паступіла і з'ехала з бацькоўскага дома, а маленькаму сыну стала сумна аднаму. Дарэчы, яе дачка па прыкладзе маці ўзяла на выхаванне прыёмных дзяцей. Праз клопат Таццяны ўжо прайшло звыш 30 дзяцей, дзесяць з іх працягваюць выхоўвацца ў дзіцячым доме сямейнага тыпу.

Маці-выхавацель выказала ўдзячнасць дзяржаве, што ўдзяляе вялікую ўвагу дзецям, якія трапілі ў складаную жыццёвую сітуацыю. «Увесь час адчуваецца дзяржаўная падтрымка, — адзначае яна. — Дзеці прыходзяць з рознымі лёсамі, характарамі, але, пажыўшы ў спрыяльнай атмасферы, мяняюцца ў лепшы бок. Я разумею, што ад мяне залежыць іх поспех, таму ўсё раблю для таго, каб яны былі шчаслівыя».

Як падзялілася з журналістамі **студэнтка гістарычнага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна Алена ЗІНЧУК**, якая выхоўвалася ў прыёмнай сям'і, ёй было восем гадоў, калі яна трапіла ў дзіцячы дом сямейнага тыпу ў Маларыце. «Новая сям'я дала мне вялікія магчымасці, — лічыць дзяўчына. — Я вельмі ўдзячна маёй маці і майму бацьку за іх падтрымку і клопат. Нягледзячы на тое, што я ўжо студэнтка, яны падтрымліваюць са мной сувязь. Прыязджаю да іх кожныя выхадныя. Люблю сваю сям'ю, вельмі ёй удзячная».

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ, Вераніка КАНЮТА.**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Сморгонский завод оптического станкостроения», Гродненская область, г. Сморгонь, ул. Якуба Коласа, д. 80, корпус 25, офис 302. УНП 500154362 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (**www.ipmtorgi.by**) |

**Предмет аукциона**

**Производственное помещение 16,9 кв. м** (420/D-55326). **Адрес: Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. Шубина, 11-21.** *Сведения о земельном участке:* общ. пл. 0,1657 га, предоставлен Продавцу на праве долевой аренды (доля: 10/1657, срок действия по 04.04.2030) для обслуживания административно-хозяйственного здания

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 10 873,49 бел. руб.** Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 30** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, то оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи.

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (ipmtorgi.by). Победителем аукциона признаётся участник, предложивший максимальную цену.

Победитель торгов, либо единственный участник, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение в размере 6 % от итоговой цены продажи предмета аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 18.11.2025 с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов. **Заявки на участие принимаются по 17.11.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35, auction@cpo.by**

**Гомельский филиал РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (организатор аукциона) информирует о проведении 31 октября 2025 г. в 10.00 открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды объекта недвижимости – помещения в здании склада, принадлежащего РУП «Гомельское отделение Белорусской железной дороги»**

**Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артёма, 23, каб. 2-7**

| № лота | Наименование объекта аренды, цель его использования | Арендуемая площадь ($м^2$) |
|---|---|---|
| 1 | **Помещение в здании склада с инв. № 350/С-121188** (для хранения товарно-материальных ценностей) | **254,7** |

**Местонахождение объекта аренды:** г. Гомель, ул. Кирова 155/5

**Начальная цена продажи права заключения договора аренды: 1 195,18 руб. Задаток: 1 195,18 руб.**
**Коэффициент** к базовой ставке арендной платы в зависимости от спроса на недвижимое имущество, его технического состояния и коммерческой выгоды от сдачи в аренду составляет **3,0.**
**Срок договора аренды: 3 года, начиная со дня заключения договора аренды. Шаг аукциона: 5 %**

**Местонахождение организатора аукциона, его контакты:**
г. Гомель, ул. Артёма, 23, тел.: +375 232 32-46-47, 32-18-95, +375 29 170-46-47, сайт: www.ino.by, e-mail: gomel@ino.by

**Извещение о проведении аукциона опубликовано 10.10.2025 г. на официальных сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и Гомельского областного исполнительного комитета gomel-region.by.**

ИНФОРМАЦИЯ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ
**по продаже пустующего жилого дома № 5 д. Перегродь**
**Мядельского района Минской области**

**Организатор повторного аукциона:**
Мядельский сельисполком Мядельского района Минской области, тел.: (801797) 40735, (801797) 22352.

**Дата проведения повторного аукциона:**
**21 ноября 2025 г. в 14.00**

**Место проведения повторного аукциона:**
**Минская обл., г. Мядель, ул. 17 Сентября, д. 7, к. 15.**

**Жилой дом № 5 в д. Перегродь Мядельского сельсовета Мядельского района Минской области;** инв. номер 633/С-1798 (назначение – здание одноквартирного жилого дома, наименование – одноэтажный деревянный жилой дом), общая жилая площадь – 63,4 кв. м, с дощатой холодной пристройкой, двумя дощатыми сараями, одним бревенчатым сараем. При доме имеется колодец.

**Начальная цена 2 521,36 рублей (две тысячи пятьсот двадцать один рубль тридцать шесть копеек).**

Извещение о проведении повторного аукциона опубликовано на официальных сайтах Минского областного исполнительного комитета **www.minsk-region.gov.by**, Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **www.gki.gov.by**, Мядельского районного исполнительного комитета **myadel.gov.by.**

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

# ВЫБАРШЧЫКІ ЯК КАМАНДА

## Асабістая адказнасць і сумесная праца — дэвіз работы ў акрузе дэпутата Віталя Уткіна

Для намесніка старшыні Пастаяннай камісіі па прамысловасці, энергетыцы, транспарце, сувязі і лічбавым развіцці Палаты прадстаўнікоў, Віталя Уткіна, дэпутата ад Гомельскай-Юбілейнай выбарчай акругі № 31 Гомель — не проста месца працы, а родны горад, з якім звязана ўсё жыццё. Тут вырас, вучыўся, будаваў кар'еру. Цяпер кожны яго прыезд сюды — магчымасць дапамагчы ў вырашэнні хвалюючых праблем жыхарам роднага горада, а таксама паўдзельнічаць у яго жыцці і далейшым развіцці.



### ЖЫВЫ ЗВАРОТ І ЖЫВАЯ РЭАКЦЫЯ

Для Віталя Уткіна час работы ў выбарчай акрузе — гэта жывыя сустрэчы, асабістыя прыёмы, выезды на тэрыторыю, тэлефонныя лініі.

На асабісты прыём да Віталя Уткіна прыходзяць людзі з самымі рознымі праблемамі. Шукаюць дапамогі ў вырашэнні паўсядзённых, але важных для іх пытанняў. Напрыклад, зварот пажылога гамяльчаніна, які не можа набыць газавы балон для дачы, бо на лецішча няма тэхнічнага пашпарта. Аказалася, такіх выпадкаў нямала. Яшчэ адзін зварот да дэпутата паступіў ад жанчыны, якая дапамагае бяздомным жывёлам. Кошт стэрылізацыі, як падзялілася жанчына, занадта высокі для валанцёраў.

— Кожны з прыведзеных зваротаў — зразумелая жыццёвая сітуацыя і за ёй стаіць канкрэтны чалавек. Мая задача не напраўляць людзей у іншыя інстанцыі, а дапамагчы, разгледзець усе законныя варыянты рашэння агучаных сітуацый і разам з адпаведнымі службовымі асобамі знайсці магчымасці аказання грамадзянам усебаковай дапамогі ў вырашэнні іх пытанняў, — тлумачыць Віталь Уткін.

### ЯКАСЦЬ ЖЫЦЦЯ ЛЮДЗЕЙ

Фармат «выездаў на месцы» таксама стаў для Віталя Юр'евіча звыклым: не за сталом, а ў двары, каля школы, на пляцоўцы... Побач з людзьмі і нараджаюцца рэальныя рашэнні праблем, перакананы дэпутат.

Напрыклад, жыхары мікрараёна № 18 Гомеля папрасілі добраўпарадкаваць старажытную крыніцу. Па ўспамінах старажылаў, у гады Вялікай Айчыннай вайны гэта крынічка паіла як жыхароў акупаванага горада, так і пасля вызвалення байцоў Чырвонай арміі, якія служылі на ваенным аэрадроме. Не адно дзесяцігоддзе не толькі мясцовыя, але і жыхары найбліжэйшых раёнаў прыходзяць сюды па ваду. Каля крыніцы з усталяваным вобразам Казанскай іконы Божай Маці гамяльчане арганізавалі купель.

Віталь Уткін прапанаваў заахвоціць студэнтаў БелДУТа распрацаваць канцэпцыю развіцця тэрыторыі. Ідэю падтрымалі і актывісты, і выкладчыкі.

Паралельна ідзе работа па камунальных пытаннях, якія ўзнімаюць выбаршчыкі. Сярод нядаўніх прыкладаў — дзякуючы ўзаемадзеянню з гарвыканкамам на вуліцы Малайчука зроблены новы асфальт і адрамантаваны пешаходныя дарожкі.

— Усе надзённыя праблемы выбаршчыкаў — ад камуналкі да адукацыі — так ці інакш упіраюцца ў нормы законаў. Таму так важна, каб дэпутаты ведалі жыццё людзей, былі тым незамянімым звяном паміж чалавекам і дзяржавай, — перакананы Віталь Уткін.

### АДКАЗНАСЦЬ ЯК ПРЫНЦЫП

Асобны кірунак дзейнасці дэпутата — дабрачыннасць і падтрымка сацыяльных праектаў у сваёй акрузе. У верасні, з нагоды пачатку навучальнага года, Віталь Уткін разам з кіраўніцтвам прадпрыемстваў Чыгуначнага раёна арганізаваў перадачу матэрыяльнай дапамогі навучальным установам. Так, фінансавыя сертыфікаты атрымалі санаторная школа-інтэрнат для дзяцей з захворваннямі касцёва-мышачнай сістэмы і сярэдняя школа № 44 імя М. А. Лебедзева.

Грамадская дзейнасць, перакананы Віталь Уткін, немагчыма без падтрымкі спорту. Сам дэпутат — уладальнік чорнага пояса і першага дана па каратэ, і гэта не проста асабістае захапленне, а частка светапогляду. Ён перакананы, што менавіта праз спорт фарміруюцца вытрымка, воля, павага да саперніка і пачуццё адказнасці. Віталь Уткін падтрымлівае работу Гомельскай абласной федэрацыі кантактнага каратэ кекусінкай, садзейнічае арганізацыі трэніровак, спаборніцтваў, паказальных выступленняў для моладзі.

— Кожная сустрэча, кожны зварот, кожная ініцыятыва — гэта частка штодзённай работы, абавязак перад людзьмі, якія даверылі прадстаўляць іх інтарэсы. Для дэпутата яго выбарчая агруга — гэта яго каманда. Калі ёсць узаемапавага, калі кожны робіць сваю справу сумленна — вынік заўсёды будзе, — рэзюмуе Віталь Уткін.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# УМОВЫ Ў ПРЫЯРЫТЭЦЕ

## У Гродзенскай вобласці разгледзелі замацаванасць маладых спецыялістаў у сельскай мясцовасці

Абмеркаванне адбылося ў рамках выязнога пасяджэння абласнога Савета дэпутатаў. Сустрэча прайшла на базе Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта.



Як заўважыла **старшыня абласнога Савета дэпутатаў Алена ПАСЮТА**, сельскія тэрыторыі не могуць развівацца без прытоку маладых кадраў. Калі яны знаходзяць сабе годную працу і шляхі самарэалізацыі, то вёска будзе жыць. У сувязі з гэтым на Гродзеншчыне вядзецца планамерная і сістэмная работа, якая садзейнічае замацаванню маладых спецыялістаў у вёсках.

На Гродзеншчыне створана нямала профільных класаў. Можна абраць медыцынскі, аграрны, педагагічны, інжынерны і іншыя кірункі. Як адзначыла Алена Пасюта, калі выпускнік ясна ўяўляе, якія перспектывы яго чакаюць у той ці іншай прафесіі, умее ставіць мэты, а побач з ім ёсць тыя, хто гатовы дапамагчы і падтрымаць у пераадоленні цяжкасцяў, то яго імкненне застацца ў прафесіі і працаваць у сельскай мясцовасці будзе перспектыўным і стабільным рашэннем.

Размова аб маладых спецыялістах не магла адбыцца без абмеркавання ўступнай кампаніі. Агучваліся розныя лічбы, але самае галоўнае — прыток кадраў ёсць. Ды гэта толькі паўсправы, складанасць заключаецца ў тым, каб утрымаць іх.

У вобласці робіцца ўсё магчымае, каб замацаванасць павысілася, ёсць нямала прыкладаў, дзе планамерная работа паказвае высокія вынікі. Напрыклад, СВК імя Сянько ў Гродзенскім раёне змог зрабіць так, што моладзь з вялікім задавальненнем застаецца працаваць тут. Як расказаў **кіраўнік гаспадаркі Валерый ШУМЕЛЬ**, у нас замацаванасць 75 %.

— Калі ўзяць апошнія 10 гадоў, то мы прынялі на працу 21 маладога спецыяліста. А 75 % — гэта добры паказчык. Можна сказаць, што трое з чацвярых застаюцца і паспяхова будуюць кар'еру. Чаму маладыя людзі выбіраюць жыццё і працу ў вёсцы? Адказ — у стварэнні для іх камфортных умоў. У першую чаргу вырашаецца пытанне з жыллём. Сем'і атрымліваюць добраўпарадкаваныя кватэры, а адзінокія спецыялісты — інтэрнат. Калі чалавек жыллё арандуе, то выдаткі кампенсуе гаспадарка. Для тых, хто прыязджае з горада, праезд аплачваецца.

Безумоўна, павысіць замацавальнасць немагчыма без годнай заработнай платы. У СВК імя Сянько яна складае 3000—5000 рублёў. Тут клапоцяцца аб здароўі супрацоўнікаў і даюць медыцынскую страхоўку да 6000 беларускіх рублёў. Пасля праходжання трох гадоў супрацоўнік становіцца членам СВК і атрымлівае так званую 13-ю зарплату. Аказваецца дапамога і на старце кар'ернага шляху, маладым спецыялістам прадугледжаны «пад'ёмныя» ў памеры 20 базавых велічынь. Ніхто не адмяняў карпаратыўную культуру: калегі віншуюць адзін аднаго са святамі, прадугледжаны падарункі і прэміі.

Асаблівая ўвага — інтэграцыі новых супрацоўнікаў у калектыў: маладому спецыялісту прызначаюць настаўніка, які дапамагае яму асвоіцца і адчуць сябе часткай каманды. Практыка паказвае, што пры наяўнасці падтрымкі, годнай узнагароды і ўвагі да супрацоўнікаў моладзь можна ўтрымаць у сельскай мясцовасці.

На пасяджэнні зрабілі аптымістычную выснову: праблемы вырашальныя пры аб'яднанні намаганняў улад, прадпрыемстваў і жыхароў.

**Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ.**
**Фота «Гродзенская праўда».**

КАРЫСНЫ ДОСВЕД

# МАЙСТАР-КЛАС АД КАПАЧОЎ

## Як на прыкладзе аднаго сельсавета дэпутаты працуюць з насельніцтвам

Штогод у Мсціслаўскім раёне Магілёўшчыны рэалізуюцца дзясяткі праектаў, накіраваных на паляпшэнне якасці жыцця. І дэпутаты ў гэтым задзейнічаны непасрэдна. Як гэта робіцца, мы паназіралі на прыкладзе Капачоўскага сельсавета, дзе нядаўна правялі выязную сесію. Кіраўнікі арганізацый, прадстаўнікі райвыканкама, дэпутаты раённага і сельскага Саветаў дэпутатаў, старасты, члены Камітэта грамадскага тэрытарыяльнага органа самакіравання падзяліліся сваімі напрацоўкамі і намецілі новыя планы.





### З ХЛЕБАМ І МАЛАКОМ

Аўтакрама ў вёску Быстрыца прыбыла па раскладзе. Праз пяць хвілін да яе пацягнуліся месцічы. Пенсіянерка Надзея Крупянкова купіла батон, апельсін, мінералку. Ацаніла выбар мясных вырабаў, але браць не стала. Здароўе, кажа, не дазваляе.

— Нас тут адсутнасцю тавараў не крыўдзяць, — ўдакладніла яна. — Былі б грошы. І прадавец падабаецца. Добра працуе, малайчына. Мы яе ведаем, а яна нас. Перажываем, калі хварэе.

Прадавец Жана Жыгунова ветліва ўсміхаецца, густы жыхароў яна ўжо ведае, як свой асабісты. Усе заказы строга на кантролі.

— У раёне 133 гандлёвыя аб'екты, сорак з іх знаходзяцца ў сельскай мясцовасці — 27 ад райспажыўкааперацыі і 13 ад прадпрымальнікаў і юрыдычных асоб, — расказвае **намеснік старшыні Мсціслаўскага райвыканкама Вольга СУДЗІЛОЎСКАЯ.** — Райспажыўкааперацыя мае найвялікшую ўдзельную вагу ў тавараабароце — каля 27,5 %.

Дзяржава аказвае істотную падтрымку — субсідзіруе маршруты, забяспечвае сістэмай Fusion для аўтаматызаванага ўліку і продажу тавараў. На жаль, Fusion не заўсёды добрая альтэрнатыва праверaным касавым апаратам. У аддаленых вёсках не паўсюль ёсць доступ да сувязі, а без гэтага загрузіць звесткі аб тавары і прадаць яго нельга.

У аграгарадку Басценавічы цэнтр жыцця — крама «Родны кут». «За месяц на 60 тысяч рублёў крама нагандлёўвае, лічба добрая, — ганарыцца **прадавец Алеся КАЛІНОЎСКАЯ**, яна ж выконвае абавязкі загадчыцы крамы. — Працуем не першы год, ведаем густы жыхароў, папярэджваем іх заяўкі і напаўняем вітрыны неабходнымі таварамі.

У аграгарадку Капачы акрамя крамы ад спажыўкааперацыі ёсць яшчэ і прыватны гандлёвы павільён. Працуе як у горадзе — кожны дзень з 8.00 да 20.00. Толькі ў нядзелю і панядзелак да 18.00. Паспяхова выконвае заяўкі сялян паштовае аддзяленне. На кастрычнік, напрыклад, ёсць заказы на лінолеум і халадзільнік.

— Мы злучальнае звяно паміж насельніцтвам і гандлем, медыцынай, ахоўваем інтарэсы людзей, — кажа **старшыня Капачоўскага сельсавета Сяргей ФЯДОСАЎ.** — У тых жа Басценавічах, нягледзячы на невялікую колькасць жыхароў — каля 200 чалавек, тавараабарот выконваецца. У продажы ёсць усё, у тым ліку прадукты для немаўляці.

### «ДАЖЫНКІ» ПРЫВАТНЫХ ПАДВОРКАЎ

Няўрымслівы Сяргей Фядосаў, які не адзін год адпрацаваў у сістэме адукацыі, да абавязкаў прывык падыходзіць творча. З яго лёгкай рукі ў Капачах з'явіўся акультураны парк «Родны» («Родимый»), назву якому давалі ўсім аграгарадком. А на возеры за населеным пунктам адноўлена старажытная крыніца. Парадак на ёй наводзіўся з удзелам жыхароў, а альтанка і лаўкі былі зроблены сваімі рукамі без адзінай бюджэтнай капейкі.

Сельсавет разам з культработнікамі распрацавалі абрад свята «Дажынкі» прыватных падворкаў пад назвай «Багач». Запрасілі ўсіх жадаючых са сваім ураджаем. Атрымалася вельмі душэўна. Да ўдзельнікаў выязной сесіі далучыўся і **старшыня Мсціслаўскага райвыканкама Юрый БЛАХІН.**

— Падчас такіх выязных сесій мы шчыльна ўзаемадзейнічаем з насельніцтвам, бачым праблемы, якія ёсць, і сумесна з дэпутатамі стараемся іх вырашаць, — паведаміў ён. — Галоўнае, каб людзі верылі, што любое іх пытанне мы не пакінем без увагі. А на мерапрыемства «Багач» можна смела запрашаць увесь раён.

— «Багач» — перспектыўны праект, — салідарная з ім **старшыня Мсціслаўскага райсавета Алена КЛЕЯНКОВА.** — У нас з кіраўнікамі сельсаветаў ёсць намер распаўсюдзіць гэты вопыт. Аб'яднаем усіх нашых актыўных і ініцыятыўных сялян, якія працуюць на зямлі, каб усім паказаць, наколькі ёсць захопленыя людзі, а заадно дапамагчы руплівцам рэалізаваць іх тавар.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**
*Мсціслаўскі раён.*

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
## ПО ПРОДАЖЕ ПУСТУЮЩИХ ЖИЛЫХ ДОМОВ

**Организатор:** Задорьевский сельский исполнительный комитет Логойского района Минской области

**Дата, время и место проведения аукциона:**
19 ноября 2025 г. в 10.00
по адресу: Логойский район, аг. Задорье, ул. Центральная, д. 5, Задорьевский сельисполком,
конт. тел.: (801774) 75 3 35, 75 3 83; (+37544) 7892553.
Эл. адрес: zadorye@logoysk.gov.by

| | |
|---|---|
| **Адрес пустующего жилого дома** | **ЛОТ 1. Минская обл., Логойский р-н, д. Хорошее, пер. 2-й Центральный, б/н**<br>**ЛОТ 2. Минская обл., Логойский р-н, аг. Задорье, ул. Молодежная, д. 17** |
| **Характеристика пустующего жилого дома** | ЛОТ 1. Одноквартирный, одноэтажный жилой дом, бревенчатый, общая площадь: 65 кв. м, печное отопление, крыша – шифер, не зарегистрирован в РУП «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»<br>ЛОТ 2. Одноквартирный, одноэтажный жилой дом, кирпичный, общая площадь: 83 кв. м, печное отопление, крыша – шифер, зарегистрирован в РУП «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» |
| **Земельный участок** | ЛОТ 1. Земельный участок, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, не зарегистрирован в РУП «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»<br>ЛОТ 2. Земельный участок, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, не зарегистрирован в РУП «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» |
| **Начальная цена** | 1 базовая величина |
| **Сумма задатка** | 20 % от начальной цены.<br>Задаток перечисляется на расчетный счет р/с BY30AKBB36006190311010000000 в ОАО АСБ «Беларусбанк», код AKBBBY2X, УНП 600537220, код платежа 04805.<br>Получатель – Задорьевский сельисполком |
| **Начало и окончание приема документов** | С даты объявления аукциона до 14 ноября 2025 года (включительно) с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 |

Аукцион проводится в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами» и Положением о порядке продажи без проведения аукционов пустующих жилых домов, организации и проведения аукционов по их продаже, утвержденному Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.09.2021 № 547

Участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также юридические лица, если иное не установлено законодательными актами и международными договорами Республики Беларусь.

**Для участия в аукционе необходимо:**
1. подать заявление об участии в аукционе по установленной форме;
2. предоставить квитанцию об оплате суммы задатка;
3. предоставить паспорт и копию его страниц, содержащих идентификационные сведения, либо нотариально удостоверенную доверенность;
4. заключить соглашение с местным исполнительным комитетом о правах, обязанностях и ответственности сторон.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с пустующим жилым домом на местности.

**Условия:** Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление ему пустующего дома в частную собственность с внесением платы за пустующий дом в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 %, обязан в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона или признания аукциона несостоявшимся:

внести плату за предмет аукциона и возместить затраты на организацию и проведение аукциона;

подать заявление о предоставлении земельного участка;

после принятия соответствующего решения – обратиться в Логойское бюро РУП «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией земельного участка и жилого дома.

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
информирует о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего
**ГУ «Минский областной центр олимпийского резерва по конному спорту»** (Продавец).

**Электронные торги состоятся 03.11.2025.**

**Лот № 1:** MAZ-555142,
кузов (рама) № Y3M55514280002458, 2008 г. в.
Начальная цена с НДС 20 % – 11 430,00 руб.

**Местонахождение:** Минский район, д. Урожайная, бывший военный городок № 104 «Урожайное» ГУ «Минский областной центр олимпийского резерва по конному спорту».

Извещение о проведении электронных торгов размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by, Единой базе au.nca.by, Минского областного исполнительного комитета minsk-region.gov.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182

# «ПРИОРБАНК»
## Открытое акционерное общество

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС 30 сентября 2025 г.

«Приорбанк» Открытое акционерное общество

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 30 сентября 2025 г. | 1 января 2025 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | АКТИВЫ | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 957 116 | 1 003 706 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 2 040 654 | 1 497 033 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 1 716 251 | 2 605 237 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 953 561 | 504 108 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 3 113 281 | 2 754 336 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 362 | 89 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 27 431 | 26 737 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 239 424 | 230 530 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | | - | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | | 784 | 1 240 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | | 27 113 | 47 280 |
| **15** | **ИТОГО активы** | **11** | | **9 075 977** | **8 670 296** |
| 16 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | | 583 | 284 |
| 18 | Средства банков | 1202 | | 328 798 | 217 378 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | | 6 214 270 | 6 217 091 |
| 20 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | - | - |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | 53 | 1 001 |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | | 123 125 | 107 442 |
| **24** | **ВСЕГО обязательства** | **120** | | **6 666 829** | **6 543 196** |
| 25 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | | 178 091 | 86 148 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | | 345 609 | 345 609 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | | 91 656 | 92 762 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | | 1 793 792 | 1 602 581 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 2 409 148 | 2 127 100 |
| **32** | **ИТОГО обязательства и собственный капитал** | **12** | | **9 075 977** | **8 670 296** |

### ОТЧЕТ о прибылях и убытках 30 сентября 2025 г.

«Приорбанк» Открытое акционерное общество

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 30 сентября 2025 г. | 30 сентября 2024 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 387 714 | 295 428 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 16 225 | 12 818 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 371 489 | 282 610 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 347 114 | 356 929 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 148 862 | 159 170 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 198 252 | 197 759 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | - | 16 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 240 458 | 220 266 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | 11 939 | (11 471) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 29 616 | (12 949) |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 21 622 | 39 670 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 212 122 | 184 910 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 16 501 | 10 645 |
| 15 | Прибыль до налогообложения | 211 | | 585 521 | 546 244 |
| 16 | Расход по налогу на прибыль | 212 | | 139 094 | 126 591 |
| **17** | **ПРИБЫЛЬ** | **2** | | **446 427** | **419 653** |

Председатель Правления М. Альдосари

Главный бухгалтер В.В. Манцивода

Дата подписания: 03 октября 2025 г.

Финансовая отчетность размещена на интернет-странице банка: https://www.priorbank.by/ priorbank-main/business-information/bank-reporting/kvartalnye-otcety

*Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 12 от 15.01.2025 года. УНП 100220190*





# ВУЧЫМСЯ НЕ ЧАКАЦЬ, А РАБІЦЬ

## Калі на ідэю адгукаюцца сэрцам



Гомельшчына рыхтуецца прымаць удзельнікаў мерапрыемства ўнікальнага для краіны фармату — Форуму грамадзянскіх ініцыятыў «Ад ідэі — да выніку». Гэта магчымасць не толькі прэзентаваць найлепшыя праекты, але і аб'яднаць аднадумцаў з розных рэгіёнаў — прадстаўнікоў мясцовых Саветаў дэпутатаў, органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, грамадскіх аб'яднанняў і актыўных грамадзян.



## ЖЫВАЯ СУВЯЗЬ

За апошнія два гады Гомельская вобласць, сапраўды, стала адной з перадавых пляцовак краіны па ўвасабленні ідэй жыхароў у рэальныя справы. Тэматыка ініцыятыў самая шырокая: ад добраўпарадкавання да праектаў па экалогіі, турызме, захаванні гістарычнай памяці.

Адзін з праектаў, які не толькі аб'яднаў людзей у карысным пачынанні, але паказаў прыклад таго, як супольная справа ўзмацняе адчуванне каранёў, — грамадзянская ініцыятыва «Код памяці». Аднайменная музейная экспазіцыя з'явілася ў сярэдняй школе № 75 г. Гомеля менавіта з самай шчырай павагі да мінулага.

Стварылі праект разам настаўнікі, вучні і жыхары мікрараёна Хутар Навабеліцкага раёна. Педагогі з вучнямі збіралі экспанаты па вёсках, прасілі родных і знаёмых прыносіць рэчы, якія захаваліся ад бабуль, прабабуль, з элементамі беларускага нацыянальнага касцюма.

> На рэалізацыю гэтай грамадзянскай ініцыятывы спатрэбілася **59 620 рублёў, з іх дзясятую частку — 6000 рублёў** — сабралі жыхары мікрараёна.

З гэтых рэчаў, сабраных фактычна сіламі ўсяго мікрараёна, і нарадзілася музейная экспазіцыя. Але праект адразу выйшаў за межы школы — сёння гэта жывы цэнтр выхавання не толькі для вучняў, іх бацькоў, педагогаў Навабеліцкага раёна, але і Гомеля і вобласці ў цэлым.

«Мы хацелі стварыць прастору, дзе дзеці могуць дакрануцца да сваіх каранёў, — дзеляцца педагогі Гомельскай школы № 75. — Каб зразумелі: гісторыя — гэта яны самі».

Экспазіцыя «Кода памяці» пабудавана такім чынам, каб расказаць пра жыццё беларускай сям'і. Яна адлюстроўвае шлях чалавека — ад нараджэння да сталасці, святы і будні. Асобна ў музейным пакоі выдзелена вясельная тэма: можна паглядзець на аўтэнтычныя куфры, у якіх нявеста захоўвала свой пасаг. Унікальны экспанат калекцыі — рэканструяваны па старажытнай фатаграфіі касцюм нявесты. Адноўлены вясельны ўбор цалкам ручной работы.

## ВЫНІК ВЫМЯРАЕЦЦА СПРАВАМІ



— Вельмі важна, што кожная падобная грамадзянская ініцыятыва нашых жыхароў пачынаецца з жадання зрабіць нешта карыснае для свайго горада, сваёй вёскі, сваёй школы. Гэта адказ на жывое пачуццё адказнасці за месца, дзе ты жывеш, — падкрэслівае **член Савета Рэспублікі, старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына ЗЕНКЕВІЧ.**

Як звярнула ўвагу сенатар, не менш важна, што пасля ўключэння ў 2023 годзе прававога інстытута грамадзянскай ініцыятывы ў Закон «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні», актыўныя жыхары населеных пунктаў атрымалі магутны дадатковы імпульс развівацца ў полі грамадзянскіх ініцыятыў.

> **Агульны аб'ём фінансавання склаў каля 333 тысяч рублёў**, з іх — звыш **34 тысяч сродкаў** сабралі самі грамадзяне. У бягучым годзе ў конкурсе ўдзельнічала ўжо 55 праектаў, 19 з іх атрымалі падтрымку ў цэлым на суму больш за **443 тысячы рублёў**, з іх **больш як 44 тысячы рублёў** — суфінансаванне жыхароў вобласці.

Па словах Кацярыны Зенкевіч, на Гомельшчыне конкурсны механізм адбору найлепшых з найлепшых праектаў грамадзянскіх ініцыятыў стаў не проста адміністрацыйнай інавацыяй, а новай культурай узаемадзеяння людзей і ўлады. Каардынацыю рэалізацыі праектаў у рэгіёне вядзе абласная асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў, якая выступае распарадчыкам бюджэтных сродкаў і арганізатарам навучання актывістаў.

Вынік уражвае: толькі за 2024 год на конкурсны адбор паступіла 111 праектных заявак, з якіх 25 прызнаны пераможцамі.

— Кожны праект паказвае, што жыхары нашых населеных пунктаў гатовы падтрымліваць развіццё сваіх тэрыторый, браць на сябе адказнасць і дзейнічаць, — падкрэсліла Кацярына Зенкевіч. — Фактычна сёння ў нас фарміруецца новае пакаленне ініцыятыўных лідараў, якія ўмеюць не проста марыць, а планаваць, узгадняць, рэалізоўваць. Асаблівую ролю ў працэсе развіцця грамадзянскіх ініцыятыў на Гомельшчыне адыгрывае адукацыйны праект «Школа рэгіянальнага развіцця». Вядома, што кожная справа пачынаецца з чалавека, які не баіцца зрабіць першы крок. І на Гомельшчыне сёння створана магчымасць для нашых грамадзян вучыць не толькі пісаць праекты, але і верыць у свае сілы, бачыць магчымасці там, дзе іншыя бачаць праблемы. І многія выпускнікі праграмы ўжо рэалізавалі свае ідэі.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

**Фота аўтара і Гомельскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў.**


Мясцовае Самакіраванне — Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;

e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, працп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 12 560. Нумар падпісаны ў 19.30 14 кастрычніка 2025 года.

# ТЭСТЫ ДЛЯ «КВАТАРАНТАЎ»

## Як людзей з інваліднасцю вучаць жыць самастойна

Аддзяленне сацыяльнай рэабілітацыі, абілітацыі інвалідаў № 3 Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Маскоўскага раёна Мінска ўнікальнае тым, што тут ва ўмовах трэніровачных кватэр, размешчаных у шматкватэрным доме аднаго з мікрараёнаў, навучаюць самастойнаму жыццю людзей з інваліднасцю. Яго загадчык і суаўтар ініцыятывы «Цёплы дом» Вольга ЕРМАЛАЕВА сёлета ўдастоена звання «Мінчанін года» у сферы сацыяльнай абароны.

### КЛОПАТ І ЦЯРПЕННЕ

Аддзяленне працуе з 2020 года і адкрыта пры падтрымцы Беларускай асацыяцыі дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам. Тут садзейнічаюць у развіцці навыкаў самастойнага пражывання хлопцам і дзяўчатам з інваліднасцю 1 і 2 груп, у якіх інтэлектуальныя парушэнні. Цягам трох месяцаў яны вучацца жыць цалкам незалежна ад бацькоў, а ў выхадныя і святочныя дні вяртаюцца дадому.

Спецыялісты па сацыяльнай рабоце і сацыяльныя работнікі, якія суправаджаюць маладых людзей кругласутачна, вучаць іх гатаваць, прыбіраць, мыць адзенне, планаваць свой бюджэт і вольны час, хадзіць у магазін і камунікаваць з акружэннем. Падапечныя цалкам акунаюцца ў хатнюю абстаноўку і спрабуюць сябе ў ролі самастойных дарослых людзей.

Безумоўна, ад сацыяльных работнікаў патрабуецца шмат клопату і цярпення, каб навучыць хлопцаў і дзяўчат часам элементарным рэчам.

— Бацькі прывыклі ўсё выконваць за сваіх дзяцей, мы ж робім акцэнт на самастойнай рабоце. Бацькі памыюць падлогу за 10 хвілін, а маладому чалавеку можа спатрэбіцца на гэта гадзіна. І тут пры навучанні патрабуецца цярпенне, з кімсьці — строгасць, з кімсьці — дабрыня, але без гэтага выніку не дасягнуць, — дзеліцца **сацыяльны работнік Арына КУПРЫЕНКА**.



Раніца ў трэніровачных кватэрах пачынаецца з гігіенічных працэдур і сняданку, які гатуюць малодыя людзі, пасля — абавязковае сумеснае планаванне.

— Кожны дзень у нас мае свой колер і пах. Згадваем, якое чысло, якое надвор'е, што будзем апранаць на вуліцу, як увогуле трэба ў такое надвор'е апранацца. У нас ёсць агульны расклад кватэры, спіс агульных спраў, бо мы павінны гатаваць абед, прыбіраць і іншае. Ёсць працоўныя майстэрні, індывідуальны расклад — для кожнага, выходзячы з яго запытаў. Маладыя людзі прыходзяць з рознымі жаданнямі: хтосьці хоча пажыць самастойна, хтосьці зусім юны і нічога не ведае пра самастойнае жыццё, — расказвае Вольга Ермалаева.

### АБУДЗІЦЬ ІНІЦЫЯТЫВУ

Большасць маладых людзей прыходзяць у аддзяленне з сем'яй, — з бацькамі можна паленавацца і пахітрыць. Пры самастойным пражыванні такой магчымасці няма. Усе ўключаны ў індывідуальную і камандную работу, хтосьці з'язджае на пэўны час у працоўныя майстэрні ці на сваё месца работы, а пасля вяртаецца да навучання бытавой дзейнасці.



— Наша галоўная задача — каб падапечныя не баяліся спрабаваць сябе ў чымсьці, у тым ліку ў самастойным жыцці. Да нас яны прыходзяць з пасіўнай пазіцыяй. А мы абуджаем у іх ініцыятыву: каб у жыцці штосьці з'явілася, трэба пастарацца, — дзеліцца **спецыяліст па сацыяльнай рабоце Дар'я ДОСІНА**.

Акрамя навучання практычным навыкам тут арганізаваны заняткі з выкарыстаннем матэрыялаў на яснай і простай мове, накіраваныя на інфармаванне аб хатнім гвалце: які яно бывае і куды звяртацца па дапамогу. А таксама на фарміраванне навыкаў бяспечных паводзін у грамадстве, у тым ліку выкладаюцца азы фінансавай граматнасці, юрыдычныя аспекты. А пасля вячэры сацыяльныя работнікі разам з маладымі людзьмі падводзяць вынікі: што зроблена за дзень, што атрымалася і не атрымалася, што было складаным, а што лёгкім.

На выхадныя яны вяртаюцца да бацькоў з дамашнімі заданнямі, якія звязаны з бытавой дзейнасцю — іх важна замацаваць у сям'і.

— Мы актыўна працуем і з бацькамі. У нас дзейнічае клуб «Цёплая сустрэча». Гэта таварыства сем'яў, якія



зацікаўлены ў самастойным пражыванні сваіх дарослых дзяцей. Мы дзелімся з імі навацыямі ў сацыяльнай сферы, а бацькі ў сваю чаргу — сваім бясцэнным вопытам. Нашы сустрэчы праходзяць штомесяц і нясуць важную місію падтрымання станоўчага статусу чалавека з інваліднасцю, — кажа Вольга Ермалаева.

Пасля такога навучання некаторыя маладыя людзі, якія маюць уласную ці сацыяльную кватэру, а таксама працоўныя рэкамендацыі, пачынаюць жыць самастойна. Дарэчы, калі такія рэкамендацыі ёсць, спецыялісты сумесна з грамадскімі арганізацыямі і службай занятасці садзейнічаюць працаўладкаванню сваіх выхаванцаў. Сярод тых, каму яшчэ трэба знайсці работу, — 22-гадовы наведвальнік аддзялення Косця. Акрамя таго, што ён навучыўся гатаваць і дапамагаць у прыборцы кватэры, малады чалавек мае яшчэ адну важную місію — эксперта-ацэншчыка па яснай мове. Ён дапамагае ствараць і адаптаваць матэрыялы на зразумелай мове для людзей з інваліднасцю. «Хачу знайсці сабе работу, каб хоць крыху зарабляць», — дзеліцца Косця.

### ПА ПОКЛІЧЫ СЭРЦА

Вольга Ермалаева ўзначальвае аддзяленне з моманту яго адкрыцця. Яна з дзяцінства марыла працаваць з людзьмі, а ў выпускным класе выйграла ў гарадскім конкурсе, прадставіўшы праект па псіхалогіі. Пасля школы паступіла ў Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ, свядома абраўшы спецыяльнасць, звязаную з сацыяльнай работай і псіхалогіяй.

— Калі маніторыла вакансіі, хацела працаваць і дапамагаць менавіта маладым людзям з інваліднасцю. Так у пачатку 2019 года прыйшла ў Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Маскоўскага раёна. Прыемна, што нашу справу заўважаюць і сёлета адзначылі на такім высокім узроўні, бо сваю ўзнагароду я раздзяляю з усім нашым калектывам. Сацыяльная абарона — работа каманды, а не аднаго чалавека. І гэта найперш адказнасць, а значыць, далей — толькі наперад і толькі лепш.

**Алена КРАВЕЦ.**

**Фота з архіва ТЦСАН Маскоўскага раёна г. Мінска.**


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Лидахлебопродукт», Гродненская область, г. Лида, ул. Булата, 1. УНП 500022448, тел. (0154) 65 25 01 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638, **www.ipmtorgi.by** |

| № п/п | Инв. № | Наименование предмета электронных торгов | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | 6076/1 | **Разбрасыватель минеральных удобрений РМУ-8000**, 2012 г. в., расположенный по адресу: Гродненская область, Лидский р-н, д. Далекие | **5 184,00** (снижена на 70 %) |
| 2 | 5183 | **Сеялка AMAZONE AVANT**, 2002 г. в., расположенная по адресу: Гродненская область, Лидский р-н, а/г Крупово | **24 096,00** (снижена на 60 %) |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать) рабочих дней** после электронных торгов

**Срок оплаты предмета аукциона: 10 (десять) рабочих** дней с момента заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by)**

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору торгов в размере 8 % от цены продажи лота № 1 и 6 % от цены продажи лота № 2 в течение 3 рабочих дней после проведения торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 09.09.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 31.10.2025 с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 30.10.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

**Организатор аукциона/ оператор:** ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191224638. www.ipmtorgi.by

**Продавец:** ООО «ДИСКОМ», 224704, Брестская обл., Брестский р-н, Тельминский с/с, 4В, вблизи д. Шебрин. УНН 809000076

| № п/п | Предмет электронных торгов | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Погрузчик электрический NISSAN** (арт. S1N1L15Q), 2007 г. в., по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Тельминский с/с, 4В, вблизи д. Шебрин | **6 000,00** |
| 2 | **Электрический вилочный погрузчик TOYOTA 7FBE15**, 2007 г. в., по адресу: г. Брест, ул. Карьерная, 9 | **20 000,00** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB 30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 5 (пять) рабочих дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **10 %** от цены продажи лота № 1 и **8 %** от цены продажи лота № 2 в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 17.11.2025 г. с 11.00 до 13.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **14.11.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

**ЗАО «Центр промышленной оценки»** (УНП 191021390) – проводит первые торги в форме открытого аукциона по продаже **дебиторской задолженности,** принадлежащей **ОАО «Мозырский спиртоводочный завод»** (Антикризисный управляющий – ООО «СтанИБор» (УНП 491343813) – производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) №118-10Б/2016).
С порядком оформления участия в аукционе, общими правилами проведения можно ознакомиться на www.bankrot.gov.by либо на сайте организатора аукциона www.cpo.by и по тел.: +375 29 805 93 30 (Светлана Павловна); +375 29 871-77-78 (Галина Владимировна).

**Аукцион состоится 18.11.2025 в 13.00** по адресу: г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 512. Заявки принимаются с 9.00 16.10.2025 по 17.11.2025 до 17.00 по указанному адресу

# ДА ЗОРАК І ПРАКТЫЧНЫХ МЭТ

## НА КАРЫСЦЬ МІРУ І ЧАЛАВЕЦТВА

Знакавай падзеяй, якая вывела краіну ў лік касмічных дзяржаў, стаў запуск у 2012 годзе Беларускага касмічнага апарата. Беларускі спадарожнік паспяхова працуе ў складзе аб'яднанай беларуска-расійскай арбітальнай групоўкі. Атрыманыя з яго дапамогай даныя служаць самым розным мэтам: ад забеспячэння нацыянальнай бяспекі і кантролю за надзвычайнымі сітуацыямі да рашэння прыкладных задач, такіх як праектаванне дарог, улік зямельных рэсурсаў і маніторынг экалагічнай абстаноўкі. Беларуская касмічная сістэма запатрабавана ў рабоце 11 міністэрстваў і ведамстваў рэспублікі.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Паводле ААН, больш за 40 % кірункаў, што забяспечваюць устойлівае развіццё краін свету, звязаны з выкарыстаннем касмічных тэхналогій. У сувязі з гэтым, як адзначыў **Пётр ВІЦЯЗЬ, начальнік упраўлення аэракасмічнай дзейнасці апарату Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі**, сучасны этап асваення космасу характарызуецца не столькі фундаментальнымі даследаваннямі, колькі яго практычным прымяненнем. «Перш за ўсё мы вывучаем і выкарыстоўваем космас на карысць чалавека і тых тэхналогій, якія развіваюцца на нашай планеце», — падкрэсліў Пётр Аляксандравіч. — Космас з'яўляецца лакаматывам развіцця эканомікі. Таму тое, што робіцца для яго вывучэння, потым паспяхова выкарыстоўваецца ва ўсіх галінах».





## НОВЫЯ ПРАЕКТЫ І МАГЧЫМАСЦІ

Актыўна развіваецца супрацоўніцтва ў рамках Саюзнай дзяржавы — ужо было выканана 8 саюзных праграм. У тым ліку ў космасе пабывала першая беларуская жанчына-касманаўт Марына Васілеўская. Яна выканала навуковую праграму, якая ўключала пяць навукова-даследчых і два адукацыйныя эксперыменты. Плануюцца і новыя амбіцыйныя праекты: у супрацоўніцтве

# ЗАЗІРНУЦЬ ЗА ГАРЫЗОНТ

## Каб на карысць выкарыстоўваць штучны інтэлект, патрэбны людзі з высокім уласным інтэлектам

IV Міжнародны форум IT-Акадэмгорада «Штучны інтэлект у Беларусі» прайшоў у Нацыянальнай акадэміі навук. Яго мэта — развіццё і каардынацыя супрацоўніцтва вучоных, спецыялістаў навукова-даследчых арганізацый, устаноў адукацыі, вытворчага і IT-сектараў, якія займаюцца даследаваннямі штучнага інтэлекту, знаходзяць эфектыўныя рашэнні для выкарыстання сучасных тэхналогій у розных галінах.

### АД МЕДЫЦЫНЫ ДА САЦЫЯЛОГІІ

«Словы «штучны інтэлект» яшчэ нядаўна былі тэмай фантастаў, усе лічылі, што гэта перспектыва аддаленай будучыні, а сёння ўжо аб'ектыўная рэальнасць», — заўважыў на адкрыцці форуму **старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Уладзімір КАРАНІК**. Ён звярнуў увагу, што развіццю такога перспектыўнага кірунку асаблівую ўвагу ўдзяляе Прэзідэнт краіны і падтрымка навукі і інавацый з'яўляецца прыярытэтам дзяржаўнай палітыкі. «Патрабаванні кіраўніка дзяржавы зазірнуць за гарызонт, забяспечыць тэхналагічную бяспеку нашай краіны немагчыма выканаць без кансалідацыі ўсіх намаганняў, кампетэнцый па выкарыстанні і развіцці штучнага інтэлекту», — адзначыў Уладзімір Каранік. Для гэтага неабходны людзі з высокім «натуральным» інтэлектам, здольныя выкарыстаць новы інструмент для выканання канкрэтных задач.



Форум якраз дазваляе аб'яднаць такіх людзей. Сёлета тут сабраліся вядучыя распрацоўшчыкі не толькі Беларусі, але і замежныя эксперты. У форуме ўзялі ўдзел больш за 250 прадстаўнікоў навукі, адукацыі, бізнесу і міжнародных арганізацый, якія вядуць даследаванні і вырашаюць практычныя задачы, звязаныя са штучным інтэлектам. Сферы прымянення новага інструменту сёння даволі шырокія: медыцына, космас, прамысловасць, інфармацыйныя тэхналогіі, сацыялогія...

### НА СЛУЖБЕ Ў ЗДАРОЎЯ І БЯСПЕКІ

Форум стаў своеасаблівым падвядзеннем вынікаў таго, што зроблена за год. У рамках яго былі ўзнагароджаны пераможцы конкурсу «Лідары штучнага інтэлекту Беларусі — 2025», дзе адзначылі найлепшыя прадукты, праекты і кампаніі, якія паспяхова ўкараняюць інтэлектуальныя прадукты ў эканоміку і сацыяльную сферу.

Была прадстаўлена маштабная выстаўка перадавых айчынных распрацовак у галіне штучнага інтэлекту і робататэхнікі. Са сваімі распрацоўкамі (а гэта больш за 150 інавацыйных


ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ юридическая компания

- Взыскание задолженности
- Проведение торгов
- Ликвидация
- Юридические услуги

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор электронного аукциона** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Староваленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайты в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by | | |
| **Продавец** | ОАО «Беларусьрезинотехника», УНП 700069297, 213829, Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Минская, д. 102 | | |
| **Первые повторные публичные торги в форме электронного аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019 в экономическом суде Могилевской области. Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) опубликовано 05.09.2025 в газете «Звязда» № 171 (30559), стр. 4** | | | |
| **Предмет электронного аукциона** | | | |
| **№** | **Наименование (назначение), адрес** | **Начальная цена, бел. руб. с учетом НДС 20 %** | **Минимальная цена, бел. руб. с учетом НДС 20 %** |
| **1** | Бытовой корпус пластмасс, комплектная трансформаторная подстанция, корпусы № 68Б, 102, место расположения: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 102/33; 102/20 | 747 468,00 | 498 312,00 |
| **2** | Автомобильный прицеп-цистерна б/у вместимостью 3 куб. м, инв. № 8591 | 1 015,20 | 676,80 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронного аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP 30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа – **ООО «Индустрия Инноваций»**

**Шаг электронного аукциона** – 5 % от начальной цены лота. В случае отсутствия ставок участников электронного аукциона начальная цена электронного аукциона поэтапно снижается равными долями 5 (пять) раз до минимальной цены или до момента совершения ставок участниками электронного аукциона

Условия участия и порядок проведения электронного аукциона размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги» https://iintorgi.by

**Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 10 (десяти) календарных дней** со дня подписания протокола о результатах электронного аукциона

**Условия оплаты предмета электронного аукциона: не позднее 30 (тридцати) календарных дней** со дня проведения электронного аукциона. Переход права собственности – после полной оплаты Имущества с момента государственной регистрации перехода права собственности органом, осуществляющим государственную регистрацию недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним

**Электронный аукцион проводится в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги», размещенном по адресу: https://iintorgi.by**

Победитель электронного аукциона либо единственный участник электронного аукциона, согласившийся повысить начальную цену предмета электронного аукциона на 5 %, обязан возместить организатору электронного аукциона затраты на их проведение и оплатить оператору ЭТП вознаграждение в размере **1–3 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения электронного аукциона**

Организатор электронного аукциона имеет право снять предмет электронного аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения электронного аукциона

**Дата и время проведения электронного аукциона:** 30.10.2025; начало электронного аукциона: 10.00; окончание электронного аукциона: 16.00; электронный аукцион продлевается на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания электронного аукциона. Заявки на участие в электронном аукционе принимаются с 15.10.2025 с 09.00 по 29.10.2025 г. до 16.00

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-300-90-03, +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by** |



**ЗАО «БелБанкротАукцион»,**
организатор торгов по продаже имущества **ОАО «Гродножелезобетон»** (УНП 500463165), объявляет о проведении **18.11.2025 г.** в 13.00 публичных торгов по адресу: г. Гродно, пер. Дзержинского, д. 17.

**Перечень предметов торгов публично размещен на сайте: bankrot-torg.by.**

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. 80297831160; Местонахождение имущества: г. Гродно, пер. Дзержинского, 17.

Продавец: ОАО «Гродножелезобетон», тел. (0152) 657599.

Организатор торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501; 80296083100; contact@bankrot-torg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере 10 % от начальной стоимости лота не позднее **14.11.2025 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с 09.00 **15.10.2025** по 17.00 **14.11.2025** по адресу: г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501.

Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах:

- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета публичных торгов;
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за 5 дней до даты проведения торгов.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах, при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Затраты на организацию и проведение торгов составили: стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счету-фактуре, возмещение за оценку по лотам № 1 – 284,58 бел. руб.; № 2 – 221,34 бел. руб.; №№ 3-46 – 3035,52 бел. руб.; №№ 47-48 – 632,40 бел. руб. (рассчитывается пропорционально стоимости лота), аукционный сбор по лотам № 11, 15-18, 28, 29 – 5 % от цены реализации предмета торгов без учета НДС (НДС 20 %), по остальным лотам 9 % от цены реализации предмета торгов без учета НДС (НДС 20 %).

Дополнительные условия: по лотам №№ 1, 2 – арест.

Срок подписания договора купли-продажи и оплаты: в течение 20 дней со дня проведения аукциона




з Расійскай Федэрацыяй распрацоўваецца новы спадарожнік звышвысокага распазнавання — 0,35 м. Расія забяспечыць сам запуск (пакуль што ён запланаваны на 2028 год), а Беларусь — стварэнне тэлескопаў і наземнай інфраструктуры. Новы спадарожнік будзе валодаць шэрагам унікальных функцый. У адрозненне ад стандартнай стэрэаздымкі, якая робіць два здымкі пад вуглом 30 градусаў, беларускі апарат будзе рабіць тры здымкі адначасова, што дазволіць будаваць дакладныя 3D-мадэлі гарадоў. З'явіцца і магчымасць здымаць відэафільмы. Як адзначае **Сяргей ЗАЛАТЫ, дырэктар унітарнага прадпрыемства «Геаінфармацыйныя сістэмы» Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі**, кірунак абсалютна новы і даволі перспектыўны, бо дынамічная здымка розных аб'ектаў дазволіць вызначаць шэраг іх змен.



Да таго ж, у краіне пачасціліся выпадкі назірання Паўночнага зззяння, што пазначыла неабходнасць даследаванняў іанасферы. Яны, у сваю чаргу, адкрываюць новыя магчымасці для прагназавання магнітных бур, якія ўплываюць на самаадчуванне метэазалежных людзей: «Для зандзіравання іанасферы мы плануем запусціць спадарожнік, створаны ў Акадэміі навук, — падкрэсліў Сяргей Анатольевіч. — Запуск плануецца ў снежні гэтага года. На дадзены момант наземная інфраструктура ўжо створана, а апарат знаходзіцца ў пускавым кантэйнеры». Акрамя таго, беларускія навуковыя распрацоўкі паспяхова прайшлі апрабацыю на Міжнароднай касмічнай станцыі: у рамках эксперымента «Стандарт Месяц» быў пратэставаны бескантактны кардыястымулятар, створаны ў Інстытуце фізіялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, неўзабаве прыбор будзе ўкаранёны ў далейшую работу.

## КОСМАС — У МАСЫ

Папулярызацыя касманаўтыкі і выхаванне маладых вучоных сталі адным з ключавых кірункаў работы НАН. Аб гэтым расказала **галоўны спецыяліст упраўлення аэракасмічнай дзейнасці апарату Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Ірына КАЗАЧОК**, адзначыўшы, што пасля палёту Марыны Васілеўскай адбыўся шэраг сустрэч моладзі з касманаўткай. У цэлым работа з падрастаючым пакаленнем вядзецца сістэмна і плённа: напрыклад, секцыя па космасе даўно стала традыцыйнай на «Фестывалі навукі». А адной з ключавых пляцовак для інтэграцыі маладых розумаў у сусветную навуковую супольнасць з'яўляецца штогадовая міжнародная канферэнцыя «Моладзь у навуцы». Вялікай папулярнасцю карыстаецца і конкурс лічбавага мастацтва «Сімфонія космасу».



Ганаровым госцем на рэспубліканскай канферэнцыі «Першы крок у навуку», дзе школьнікі прадстаўляюць свае распрацоўкі, у 2025 годзе стала Наталля Гагарына, пляменніца першага касманаўта. З размахам сёлета адзначылі і Сусветны дзень авіяцыі і касманаўтыкі: прымеркаванае да свята маштабнае мерапрыемства прайшло ў Пасольстве Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі.

**Галоўнай падзеяй асветніцкай дзейнасці стане Беларускі касмічны кангрэс, запланаваны на 21—23 кастрычніка 2025 года. Мерапрыемства, якое праходзіць раз на 3 гады, збярэ вучоных з Беларусі, Расіі і іншых краін для абмену навуковымі дасягненнямі і ўмацавання міжнароднага супрацоўніцтва ў касмічнай сферы.**

**Аміна НАЗАРАВА**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**



праектаў) знаёмілі інстытуты НАН, навучальныя ўстановы, прадпрыемствы, вядучыя IT-кампаніі. Тут можна было ўбачыць, як пашыраецца прымяненне штучнага інтэлекту.

Так, рэзідэнт Мінскага гарадскога тэхнапарка, кампанія «Альгімед Тэхна» прэзентавала аўтыматызаваную сістэму для вадкаснай цыталогіі, якая ўжо сёння спрашчае работу ўрачоў лабараторнай дыягностыкі і дазваляе заўважаць змены на больш высокім, малекулярным узроўні. Рабатызаваная сістэма будзе карыснай не толькі для выяўлення праблем з жаночым здароўем, па сутнасці гэта адзін з крокаў да развіцця больш персаналізаванай медыцыны. Падчас назірання за пацыенткамі можна адсочваць найбольш эфектыўныя метады лячэння і падбіраць тыя, якія будуць падыходзіць іншым жанчынам з падобнымі праблемамі.

Аб'яднаны інстытут праблем інфарматыкі НАН, які з'яўляецца арганізатарам форуму, прадставіў шэраг распрацовак, сярод якіх інтэлектуальныя сістэмы кіравання мабільнымі робатамі і сельгастэхнікай, тэхналогіі для адсочвання захворванняў раслін і распрацоўкі новых лекаў, выкарыстанне штучнага інтэлекту для дыягностыкі захворванняў лёгкіх.

Кіраўнік навукова-даследчай лабараторыі рабатазываных сістэм Ваеннай акадэміі Аляксандр Пузанаў расказаў пра комплексную сістэму супрацьдзеяння беспілотным лятальным апаратам «Цішыня», якая дазваляе па шуме рухавікоў беспілотных лятальных апаратаў на малой вышыні выяўляць аб'екты і назіраць за імі. Гэта распрацоўка вучоных прайшла палявыя выпрабаванні і рыхтуецца да дзяржаўных іспытаў для далейшай прыёмкі на ўзбраенне. Але ўжо і сёння яна аказалася карыснай — былі дадзены рэкамендацыі прадпрыемствам ваенна-прамысловага комплексу па выбары вінта для беспілотных лятальных апаратаў, каб яны мелі меншы ўзровень акустычнага шуму і іх складаней было адсачыць. Між іншым, як заўважыў Аляксандр Пузанаў, распрацоўкі Ваеннай акадэміі могуць быць карыснымі і ў мірных мэтах.

Сёння, калі дроны ўсё актыўней выкарыстоўваюцца ў розных галінах: у картаграфіі і геадэзіі, прамысловасці і сельскай гаспадарцы, для папярэджвання лясных пажараў і пошуку людзей, маніторынгу тэрыторый, фота- і відэаздымак, — неабходна клапаціцца аб падрыхтоўцы аператараў, якія змогуць кіраваць лятальнымі апаратамі. Навыкі пілатавання, у тым ліку пралёт на хуткасці ці ў складаных умовах, дазваляюць адпрацаваць сімулятары палётаў. Першы ў Беларусі сістэмны інтэгратар беспілотных рашэнняў кампанія «Copter.by» прадставіла на выстаўцы серыю сімулятараў палётаў, а таксама распрацоўкі, якія могуць выкарыстоўвацца ў дзіцячых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах.

Сваімі напрацоўкамі падчас форуму падзяліліся і маладыя людзі. Так, навучэнка Мінскага радыётэхнічнага каледжа падрыхтавала праект сістэмы для бяспечнага пераходу дарогі, а студэнты факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій БДУ прадставілі аэрадынамічную платформу для тэсціравання сістэм арыентацыі і пазіцыянавання нанаспадарожнікаў і мультыаб'ектныя сістэмы для разгортвання атмасферных зондаў.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**


**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении повторных электронных торгов по комбинированной схеме
(на повышение и понижение цены недвижимого имущества) по продаже имущества, принадлежащего
**ОАО «Газпром трансгаз Беларусь»** (Продавец)
на праве собственности.

**Электронные торги проводятся 31.10.2025.**

**Лот № 1:** Встроенное помещение ФОК
с инв. № 240/D-37688, 283,3 кв. м.

Адрес: Витебская обл., г. Орша, ул. Свердлова, д. 24.

**Начальная цена с НДС 20 %** – 400 612,32 руб.
**Минимальная цена с НДС 20 %** – 240 367,52 руб.
**Задаток** – 40 061,23 руб.

Шаг электронных торгов на повышение – 1 % от начальной цены (4 006,12 руб.).

Шаг электронных торгов на понижение – 1 % от начальной цены (4 006,12 руб.).

Срок для подписания договора купли-продажи: 20 (двадцать) рабочих дней со дня проведения электронных торгов (после предъявления Продавцу платежного документа, подтверждающего оплату вознаграждения Организатора электронных торгов).

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой пло-щадки «GOSTORG» (далее – ЭТП) и Правилами проведения электронных торгов по комбинированной схеме, размещенными на детальной странице лота на ЭТП.

Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **29.10.2025 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by.**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by.**

УНП 190055182



**Могилевский филиал**
**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
**(организатор аукциона)**
**информирует о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего РУП «Белпочта» (Продавец) на праве хозяйственного ведения**

**Электронные торги состоятся 06.11.2025 в 11.00**
**на электронной торговой площадке GOSTORG.BY**

Лот № 1: **Автомобиль UAZ 390995-441**, г. в. 2014, тип кузова – грузопассажирский вагон, р/з АЕ 5862-6, VIN № 390900E0202239, XTT390995E0413285, инв. № по бух учёту 514327;

**Начальная цена продажи: 3 561,51 бел. руб. без учета НДС. Сумма задатка: 356,15 бел. руб.**

Лот № 2: **Автомобиль UAZ 33036 5-423 KUPAVA 27YA20**, г. в. 2013, тип кузова – грузовой специальный фургон, р/з АЕ 5265-6, VIN № Y3H27YA20D0066568, XTT330365E0406290, инв. № по бух учёту 514310.

**Начальная цена продажи: 4 136,31 бел. руб. без учета НДС. Сумма задатка: 413,63 бел. руб.**

Лот № 3: **Автомобиль GAZ 3302 1288 KUPAVA-232500**, г. в. 2010, тип кузова – грузовой фургон изотермический, р/з АВ 3671-6, VIN № 330200A0602756, Y3H232500A0056407, инв. № по бух учёту 514271; **Начальная цена продажи: 3 190,68 бел. руб. без учета НДС. Сумма задатка: 319,07 бел. руб.**

Лот № 4: **Автомобиль UAZ 33036 KUPAVA 27YA20**, г.в. 2013, р/з АЕ 2515-6, тип кузова – грузовой специальный фургон, VIN № Y3H27YA20D0066567, XTT330365E0406563, инв. № по бух учёту 514317; **Начальная цена продажи: 4 136,35 бел. руб. без учета НДС. Сумма задатка: 413,64 бел. руб.**

Лот № 5: **Автомобиль PEUGEOT PARTNER PGP79**, г. в. 2010, тип кузова – грузопассажирский вагон, р/з АВ 4537-6, VIN № VF3GAWJYBAX513586, Y39179000A0075060, инв. № по бух учёту 514278.

**Начальная цена продажи: 2 971,48 бел. руб. без учета НДС. Сумма задатка: 297,15 бел. руб.**

Лот № 6: **Автомобиль PEUGEOT PARTNER PGP79**, г. в. 2010, тип кузова – грузопассажирский вагон, р/з АВ 4554-6, VIN № VF3GAWJYBAX513580, Y39179000A0075061, инв. № по бух учёту 514279.

**Начальная цена продажи: 2 971,31 бел. руб. без учета НДС. Сумма задатка: 297,13 бел. руб.**

**Местоположение лотов:**
**Лот № 1: г. Чаусы, ул. Октябрьская, 1а;**
**Лоты №№ 2–3, 5–6: г. Могилев, ш. Гомельское, 23;**
**Лот № 4: г. Кричев, ул. Советская, 111.**

Извещение о проведении электронных торгов размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь, Могилевского облисполкома и на торговой площадке GOSTORG.BY. Организатор торгов и оператор ЭТП**: Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»,** УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by.

Доп. информацию можно получить по тел.: **+375222-72-41-14, +37529-624-26-25,** на сайте ЭТП **www.gostorg.by**



**ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ**
**по продаже права заключения договора аренды имущества 11 ноября 2025 года**

| № лота | Наименование и местонахождение объекта | Площадь, кв. м | Начальная цена продажи, руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. № 400/С-112947 (здание кафе) г. Гродно, **ш. Скидельское, 2/18** | 358,5 | 1 177,58 |

Срок договора аренды: 3 года.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости»: 8 (152) 62-60-55, 62-60-56.

Аукцион состоится **11 ноября 2025 г. в 12.00** в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, актовый зал.

Заявления принимаются **по 4 ноября 2025 года.**

Извещение размещено на сайтах: Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **https://au.nca.by,** Гродненского городского исполнительного комитета **http://grodno.gov.by,** ГП «Гродненский центр недвижимости» **http://gcn.by**

НА СЛЫХУ

# МАХЛЯР НЕ ПАВІНЕН ВЫВЕСЦІ З РАЎНАВАГІ

## Варта развіць крытычнае стаўленне да ўсіх ананімных званкоў

**Такім чынам акрэсліў асноўную мэту сваёй работы намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення па супрацьдзеянні кіберзлачыннасці МУС Аляксандр РЫНГЕВІЧ. Ён, у прыватнасці, паведаміў, што сёлета за 9 месяцаў у нашай краіне зафіксавана каля 13,5 тысячы кіберзлачынстваў. Гэта практычна на 11 % менш у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Пры гэтым 96 % усіх злачынстваў складаюць крадзяжы, махлярствы і вымагальніцтва. «Усяго толькі 4 % злачынстваў звязаныя з іншым несанкцыянаваным доступам да камп'ютарнай інфармацыі, ілжывымі паведамленнямі аб небяспецы і іншымі», — заўважыў Аляксандр Рынгевіч.**

Паводле яго слоў, ужо больш за паўтара года ў Беларусі дзейнічае Указ № 269, які накіраваны на процідзеянне махлярству, звязанаму з банкамі. Ён дазваляе эфектыўна ўзаемадзейнічаць людзям з органамі ўнутраных спраў, а работнікам органаў з дапамогай спецыяльна створаных дзяжурных службаў у фармаце 24/7 перадаваць указаную інфармацыю банкаўскаму сектару. Гэта дазваляе ў пэўнай меры захоўваць ужо выкрадзеныя грошы грамадзян.

### ПА ШМАТУЗРОЎНЕВЫХ СХЕМАХ

Як адзначыў Аляксандр Рынгевіч, Беларусь — адзіная дзяржава на прасторах СНД, дзе адзначаецца зніжэнне колькасці кіберзлачынстваў. Іх доля ў агульнай колькасці злачынстваў вырасла і складае 29 %. «Пры гэтым колькасць цяжкіх злачынстваў, калі грамадзянам прычыняюць шкоду ў значным памеры, вырасла, хоць і нязначна. Па выніках 9 месяцаў такіх у нас 2,1 тысячы», — падкрэсліў Аляксандр Рынгевіч.

На працягу года сітуацыя можа рэзка мяняцца, бо махлярства часта мае сезонную накіраванасць. Так, у верасні 45 % усіх кіберзлачынстваў былі звязаны са званкамі махляроў грамадзянам пад рознымі падставамі, калі яны імкнуцца зрабіць свае злачынствы шматузроўневымі. Напрыклад, ахвяра адказвае на званок і ўстанаўлівае адносіны з ашуканцам, але не дае яму важнай інфармацыі. Пазней паступае другі званок. Гэтым разам махляр прадстаўляецца супрацоўнікам праваахоўных органаў і паведамляе ахвяры, што тая нібыта здзейсніла злачынства, магчыма, нават удзельнічала ў фінансаванні нейкай экстрэмісцкай дзейнасці. Грамадзяне не чакаюць, што ашуканцы выкарыстоўваюць такую схему, і часта вераць другому чалавеку. Галоўнае, чаго дамагаюцца злачынцы, — вывесці чалавека з раўнавагі, каб ён запанікаваў і стаў лёгка кіраваным.

«Асноўная мэта нашай работы — не абараніць грамадзян ад канкрэтнай прапановы або спосабу махляра, а развіць крытычнае стаўленне да ўсяго. Трэба аналізаваць, хто вам тэлефануе, што кажа. Толькі такім чынам можна сябе абараніць», — заўважыў Аляксандр Рынгевіч.



### TELEGRAM, INSTAGRAM, VIBER...

«Найбольш распаўсюджаным правапарушэннем у нас з'яўляецца кіберзлачыннасць. Часцей за ўсё ў Telegram, што складае прыкладна трэць ад выкарыстоўваемых сродкаў камунікацыі з пацярпелымі. Далей ідуць Instagram (26 %), Viber (22 %) і WhatsApp (6 %)», — заявіў **намеснік начальніка ўпраўлення арганізацыі расследавання кіберзлачынстваў і лічбавага развіцця Следчага камітэта Леанід МЕЛЬНІК**. Паводле яго слоў, асноўнымі падставамі пры здзяйсненні махлярства з'яўляюцца абарона грашовых сродкаў ад дзеянняў зламыснікаў, страхаванне і дэклараванне грашовых сродкаў. Пры гэтым пры здзяйсненні вішынгу часта выкарыстоўваюцца абаненцкія нумары, зарэгістраваныя ў тым ліку на абанентаў Беларусі. Але з верасня ўступіла ў дзеянне пастанова ўрада, якая дазваляе блакіраваць такія сім-карты ў аператыўным рэжыме.

Следчым камітэтам распрацавана спецыялізаванае праграмнае забеспячэнне ў выглядзе Telegram-бота AntiScam, з дапамогай якога любы грамадзянін можа ўдакладніць актуальныя звесткі аб тым, ці з'яўляецца гэты Instagram ашуканскім. Леанід Мельнік дадаў, што ў першым паўгоддзі ўдалося дасягнуць зніжэння кібервымагальніцтваў на 22 %. Пераважаюць выпадкі, звязаныя з блакіраваннем, мадыфікацыяй або знішчэннем камп'ютарнай інфармацыі. У асноўным гэта блакіраванне iCloud, што дасягаецца з дапамогай розных спосабаў. Людзі знаёмяцца ў сацыяльных сетках або спецыялізаваных Telegram-ботах. У ходзе размовы зламыснік на падставе аказання дапамогі ў загрузцы файла прапануе ўвайсці ў нібыта свой iCloud, пасля чаго адбываецца блакіраванне ўліковага запісу.

Па словах Леаніда Мельніка, з мэтай блакіравання ашуканскіх акаўнтаў, якія выкарыстоўваюцца кібервымагальнікамі для зносін з ахвярамі, Следчым камітэтам наладжана работа па блакіраванні дадзеных уліковых запісаў і фішынгавых спасылак. Акрамя таго, ажыццяўляецца маніторынг розных прылад, у суд накіроўваюцца справы па скам-групах, праводзіцца работа па выяўленні дроп-сэрвісаў, якія аказваюць паслугі па вывядзенні выкрадзеных грашовых сродкаў.

### АСОБНАЯ АДКАЗНАСЦЬ

У сярэдзіне лета значная колькасць кіберзлачынстваў здзяйснялася з выкарыстаннем абаненцкіх нумароў, у тым ліку прыналежных беларускім аператарам сувязі. «Калі пацярпелы бачыць, што з ім размаўляюць з беларускага абаненцкага нумара, давер да такой асобы ўзрастае. Ёсць прыклады ўстанаўлення асоб, якія выкарыстоўваюць сімбоксы і пры дапамозе анлайн-сэрвісаў вызначаюць спецыяльнае праграмнае забеспячэнне, змяшчаючы ў іх сімкарты, афармленыя на сябе альбо атрыманыя ў трэціх асоб. Такім чынам фактычна ствараецца інфраструктура для здзяйснення злачынства. Цяпер разглядаецца пытанне ўвядзення асобнай адказнасці за дзейнасць падобнага роду», — расказаў **старшы пракурор упраўлення Генеральнай пракуратуры Максім СЕНІЎ**.

Паводле яго слоў, аналіз крымінальных спраў, узбуджаных з 1 да 10 кастрычніка гэтага года, сведчыць аб тым, што значная колькасць злачынстваў звязана са схіленнем пацярпелых да пераводу грашовых сродкаў на падкантрольныя зламысніку банкаўскія рахункі, у тым ліку і замежныя. Часта ашуканцы здзяйсняюць супрацьпраўныя дзеянні з-за мяжы, рэгіструюць банкаўскія плацежныя карты і тэлефонныя нумары на падстаўных асоб і выводзяць выкрадзеныя грашовыя сродкі за межы Беларусі.

«На адным з пасяджэнняў міжведамаснай рабочай групы прапрацоўваліся ў тым ліку пытанні неабходнасці змянення і ўдасканалення парадку выдачы крэдытаў фізічным асобам, каб выключыць верагоднасць іх афармлення трэцімі асобамі або пад іх уздзеяннем. Абмяркоўвалася таксама прыняцце дадатковых мер для спынення банкамі патэнцыяльна ашуканскіх аперацый, у прыватнасці пры пераводзе грашовых сродкаў за мяжу», — дадаў Максім Сеніў.

**Сяргей КУРКАЧ.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ОАО «Н Холдинг» проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности ОАО «Минский завод «Термопласт»**

**Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Н Холдинг» по организации и проведению аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **ЛОТ № 1** | Капитальное строение с инв. № 500/С-34787, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Кнорина, 50/27. Площадь – 5586,0 кв. м. Наименование – Ж 1-2/К Здание специализированное для общественного питания. Назначение – Здание специализированное для общественного питания. Теплообменник ВТ-012-22/22Ц, ячейки ЩО-59, трансформатор ТМ 630-10/04 (2 шт.), станция СУ-9543-11М (3 шт.), станция СУ-9542-13М (2 шт.), станция СУ-9452, камера КСО-366 (3 шт.), ячейка КСО-266 (3 шт.), ячейка КСО-366. Капитальное строение расположено на земельном участке с кадастровым номером 500000000009001120, площадью 1,146 га, предоставленном ОАО «Минский завод «Термопласт» на праве постоянного пользования (срок действия: не установлен). Объект недвижимости обременен правом аренды. На земельном участке установлены следующие ограничения (обременения): охранная зона электрических сетей, площадь 0,0230 га, охранная зона объектов газораспределительной системы, площадь 0,0545 га | | | | |
| **Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **7 912 644,00** | **Задаток, BYN** | **500 000,00** | **Шаг аукциона** | 5 % |
| **ЛОТ № 2** | Изолированное помещение с инв. № 500/D-7988205136, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Калиновского, 6/3-2. Площадь: 2921,1 кв. м. Наименование: Производственное помещение. Назначение: Производственное помещение. Обременение: аренда | | | | |
| **Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **2 619 120,00** | **Задаток, BYN** | **261 912,00** | **Шаг аукциона** | 5 % |
| **ЛОТ № 3** | Капитальное строение с инв. № 500/С-22919, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Кнорина, д. 50. Площадь – 4056,3 кв. м. Наименование – Здание административно-хозяйственное, литер А 7/к-кп. Назначение – Здание административно-хозяйственное. Обременение: аренда. Капитальное строение расположено на земельном участке с кадастровым номером 500000000009007867, площадью 0,1422 га, предоставленном ОАО «Минский завод «Термопласт» на праве аренды (срок действия: по 30.04.2031). На земельном участке установлены следующие ограничения (обременения): охранная зона линий связи и радиофикации, площадь 0,0133 га; охранная зона сетей и сооружений водоснабжения, площадь 0,0230 га; охранная зона сетей и сооружений канализации, площадь 0,0038 га | | | | |
| **Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **7 500 000,00** | **Задаток, BYN** | **750 000,00** | **Шаг аукциона** | 5 % |
| **Иные условия по ЛОТУ № 3** | Победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан не позднее 1 (одного) рабочего дня с даты государственной регистрации перехода права собственности на капитальное строение (Лот № 3) заключить с продавцом договор безвозмездного пользования частью капитального строения (Лот № 3), площадью 356,6 кв. м (кабинеты 1 этажа) сроком на 3 (три) года, а также заключить соглашение об установлении безвозмездного бессрочного сервитута на вестибюль 1 этажа | | | | |

| | |
|---|---|
| **Сведения о продавце, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «МИНСКИЙ ЗАВОД «ТЕРМОПЛАСТ» Республика Беларусь, 220103, г. Минск, ул. Кнорина, 50. Тел. +375172811340. E-mail: office@oaotermoplast.by |
| **Сведения об организаторе аукциона** | ОАО «Н Холдинг» 220029, г. Минск, пр-т Машерова, 11, пом. 1. Тел. 8 029 754 63 46 (Мария) |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **10 (десяти) рабочих дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона |
| **Возмещение затрат на организацию и проведение аукционов** | Победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, в течение 5 (пяти) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона, а также в течение 3 (трех) рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона выплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 1 % от цены продажи предмета аукциона на основании счета, выставленного организатором аукциона |
| **Условия оплаты** | Оплата задатка производится резидентами в белорусских рублях (нерезидентами – в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты) в срок не позднее даты подачи заявления на участие в аукционе на следующие банковские реквизиты: р/с BY79 AKBB 3012 0000 1634 1000 0000 (BYN) в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, 220005, г. Минск, пр-т Независимости, д. 56. Получатель – Открытое акционерное общество «Н Холдинг», УНН 101059240, ОКПО 37392696. Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за объект, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона |
| **Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе** | Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **по 12 ноября 2025 года (включительно)** в рабочие дни с 9.00 до 16.55 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1 |
| **Место, дата и время проведения аукциона** | Открытый аукцион состоится **13 ноября 2025 года** адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1, зал совещаний ОАО «Н Холдинг»: **По ЛОТУ № 1 в 11.00; По ЛОТУ № 2 в 12.00; По ЛОТУ № 3 в 15.00** |
| Организатор аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время, без объяснения причин, но не позднее чем за 3 календарных дня до даты проведения аукциона, указанной в извещении о проведении аукциона, отказаться от его проведения | |

# «ЛЕБЯДЗІНАЕ ВОЗЕРА»: ТРЫУМФ КЛАСІКІ І ПРАФЕСІЯНАЛІЗМУ

## Зорка аднаго з вечароў праекта «Жыццё ў прафесіі» — народная артыстка Беларусі Вольга Гайко



**Калі юная балерына Вольга Гайко, толькі скончыўшы Беларускі дзяржаўны харэаграфічны каледж, упершыню выйшла на сцэну ў вобразах Адэты-Адыліі, было зразумела: нарадзілася зорка. У 18 гадоў станцаваць у «Лебядзіным...» галоўную партыю — неверагодна!.. Але выдатная тэхніка, прыгожая вытанчаная пастава — усё было для таго, каб яна стала прымай-балерынай. І яна стала ёй вельмі хутка пасля таго, як паступіла на працу ў Вялікі тэатр Беларусі. Гэта было ў 1997 годзе, і ўвесь гэты час яна адданая толькі аднаму тэатру, дзе служыць больш за 25 гадоў.**

Быў час, калі яе нават называлі «наша Плісецкая» — не толькі з-за знешняга падабенства, але і з-за шыкоўных творчых магчымасцяў. Аднак Вольга Гайко адстаяла сваё права быць асобай з уласным моцным характарам, дзіўнай працавітасцю і жаданнем пазнаваць балет як мага больш глыбока, каму ў прафесіі было падуладна шмат што. Вынік — больш як 30 яркіх галоўных партый за час актыўнай кар'еры. Не толькі Адэта-Адылія, але і Кармэн, Джульета, Фрыгія ў «Спартаку», Нэле ў «Тылі Уленшпігелі», узнёслая Жізэль, Сільфіда, Эсмеральда, Рагнеда ў балеце «Страсці»... Нават легендарную балерыну Іду Рубінштэйн, апантаную танцам, яна ўвасобіла пераканаўча — сама адчувала тое ж. Ёй не было складана працаваць з рознымі харэографамі: прафесіяналізм —



выдатная тэхніка плюс здольнасць артысткі быць рознай. Гэта засведчыла якраз партыя Адэты-Адыліі, нездарма на міжнародным фестывалі балетнага мастацтва ў Токіа ў 2010 годзе беларускую пару ў складзе Вольгі Гайко і Агара Аношкі адзначылі спецыяльным прызам за найлепшае выкананне вядучых партый у спектаклі «Лебядзінае возера»...

І нават пасля цяжкай траўмы, якая здарылася на піку кар'еры, яна засталася ў балеце і тэатры, фактычна навучыўшыся хадзіць наноў. А танец — быццам бы натуральная ўласцівасць цела. Ужо пасля лячэння і вяртання Вольга Гайко здолела выканаць 32 фуэтэ ў «Лебядзіным...»

І вось юбілярка гэтага года, лаўрэат міжнародных конкурсаў, уладальніца прэміі «За духоўнае адраджэнне», народная артыстка Беларусі Вольга Гайко 12 кастрычніка мела бенефіс. Яна выходзіла на сцэну ў спектаклі, які стаў для яе лёсавызначальным: у «Лебядзіным возеры» паўстала ў ролі Уладарнай прынцэсы. Але яна мела дачыненне да падрыхтоўкі трох выканальніц партыі Адэты-Адыліі, якія танцавалі гэтым вечарам: Лізаветы Мусорынай, Марыі Музалеўскай, Настассі Юркевіч. А публіка ведала, хто сапраўдная гераіня вечара, і чакала Вольгу Гайко на «аўтограф-сесію».

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Строймаш»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 2118 | 1. Гидростанция УС-12, инв. № 1535; 2. Пресс гидравлический 250 т 1 ст. П6334А (без гидростанции), инв. № 1500; 3. Механизм догибания коуша УС-1005, инв. № 1536; 4. Установка мерной подачи каната УС-1003, инв. № 1533; 5. Установка сборки чалок УС1001, инв. № 1532 | 36 090,00 | 3 609,00 | 1 804,50 |
| 2119 | 1. Установка для испытания строп (Строймаш), инв. № 2321; 2. Гидростанция УИС 581, инв. № 2321А | 7 920,00 | 792,00 | 396,00 |
| 2120 | Пресс кривошипный 1 ст. К115А, инв. № 1910 | 4 230,00 | 423,00 | 211,50 |
| 2121 | Станок для заплетки канатов УС06, инв. № 1778 | 6 750,00 | 675,00 | 337,50 |
| 2122 | Станок для заплетки канатов УС06, инв. № 1779 | 6 750,00 | 675,00 | 337,50 |
| 2123 | Пресс гидравлический 150 т ОУ-660-00-00, инв. № 2480 | 6 390,00 | 639,00 | 319,50 |
| 2129 | Аквадистилятор электр. аптечный ДЭ-4-02 ЭМО, инв. № 3639 | 729,00 | 72,90 | 36,45 |
| 2130 | Станок специальный алмазной заточки СМ108А, инв. № 1683 | 405,00 | 40,50 | 20,25 |
| 2131 | Станок вертикально-расточной 2У430, инв. № 2268 | 6 300,00 | 630,00 | 315,00 |
| 2132 | Станок для нарезки трубы ССЗ-2МС, инв. № 1675 | 990,00 | 99,00 | 49,50 |
| 2133 | Станок обдирочно-точильный СМ-108А, инв. № 1854 | 387,00 | 38,70 | 19,35 |
| 2134 | Аппарат для плазменной резки INVERTEC PC-100, инв. № 3791 | 3 780,00 | 378,00 | 189,00 |
| 2135 | Сварочный аппарат JASIC MZ-1000, инв. № 4079 | 15 030,00 | 1 503,00 | 751,50 |
| 2136 | Станок вертикально-сверлильный 2А135, инв. № 2020 | 1 530,00 | 153,00 | 76,50 |
| 2137 | Ножницы кривошипные с накладными ножами Н475, инв. № 1562 | 3 240,00 | 324,00 | 162,00 |
| 2138 | Станок для калибровки УС-05, инв. № 1243 | 2 790,00 | 279,00 | 139,50 |
| 2139 | Станок для резки керамических изделий УС-14, инв. № 1399 | 288,00 | 28,80 | 14,40 |
| 2140 | Станок круглопильный ЦМЭ-3А, инв. № 2016 | 2 070,00 | 207,00 | 103,50 |
| 2141 | Стол сварщика С100.40, инв. № 1411 | 603,00 | 60,30 | 30,15 |
| 2145 | Станок консольно-фрезерный 6Р81, инв. № 2809 | 5 220,00 | 522,00 | 261,00 |
| 2146 | Установка для переработки резины в жгут, инв. № 3703 | 5 220,00 | 522,00 | 261,00 |
| 2147 | Станок полировальный Н/М, инв. № 3674 | 405,00 | 40,50 | 20,25 |
| 2148 | Фланце-гибочный станок ВМС-92.000, инв. № 2737 | 990,00 | 99,00 | 49,50 |
| 2149 | Координатно-расточной 2Е440А, инв. № 1718 | 6 750,00 | 675,00 | 337,50 |
| 2150 | Полуавтомат заточной 3692, инв. № 2192 | 414,00 | 41,40 | 20,70 |
| 2151 | Полуавтомат заточной 3692, инв. № 2236 | 576,00 | 57,60 | 28,80 |
| 2152 | Стол сварщика С100.40, инв. № 1401 | 801,00 | 80,10 | 40,05 |
| 2153 | Стол сварщика С100.40, инв. № 1402 | 801,00 | 80,10 | 40,05 |
| 2155 | Станок для перемотки сварочной проволоки МО-48, инв. № 1437 | 2 880,00 | 288,00 | 144,00 |
| 2156 | Станок токарно-винторезный МК- 6056, инв. № 1370 | 6 480,00 | 648,00 | 324,00 |
| 2158 | Станок обдирочно-шлифовальный 3Б634, инв. № 2342 | 567,00 | 56,70 | 28,35 |
| 2159 | Прибор Б-10М (биениемер), инв. № 1292 | 531,00 | 53,10 | 26,55 |
| 2160 | Станок для намотки катушек, инв. № 2422 | 486,00 | 48,60 | 24,30 |
| 2162 | Станок горизонтально-расточной 2А622, инв. № 1826 | 27 720,00 | 2 772,00 | 1 386,00 |
| 2165 | Токарно-винторезный станок 16А20Ф3С39, инв. № 1327 | 6 840,00 | 684,00 | 342,00 |
| 2166 | Станок токарно-винторезный МК-6056, инв. № 1365 | 7 560,00 | 756,00 | 378,00 |
| 2167 | Станок токарно-винторезный МК-6056, инв. № 1368 | 7 560,00 | 756,00 | 378,00 |
| 2168 | Станок токарно-винторезный МК-6056, инв. № 1369 | 7 560,00 | 756,00 | 378,00 |
| 2171 | Станок поперечно-строгальный 7М37, инв. № 2049 | 2 160,00 | 216,00 | 108,00 |
| 2172 | Станок зубодолбежный 5Б150, инв. № 2165 | 29 520,00 | 2 952,00 | 1 476,00 |
| 2173 | Станок шлицефрезерный 5350, инв. № 2241 | 9 810,00 | 981,00 | 490,50 |
| 2174 | Полуавтомат зубофрезерный 53А30П, инв. № 1809 | 16 290,00 | 1 629,00 | 814,50 |
| 2175 | Полуавтомат зубофрезерный 5А326, инв. № 1371 | 41 670,00 | 4 167,00 | 2 083,50 |
| 2176 | Полуавтомат зубофрезерный БК32А, инв. № 2320 | 5 940,00 | 594,00 | 297,00 |
| 2177 | Станок круглошлифовальный (полуавтомат) 3У131, инв. № 1555 | 16 020,00 | 1 602,00 | 801,00 |
| 2179 | Станок внутришлифовальный (полуавтомат) 3М227В, инв. № 1251 | 11 250,00 | 1 125,00 | 562,50 |

В отношении лотов проводятся третьи повторные торги. **Стоимость снижена на 25 %.**
Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» от 23.09.2025

**Местонахождение:** г. Минск, ул. Рыбалко, 26

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **28 октября 2025 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | с 10.00 15 октября 2025 года до 16.00 24 октября 2025 года |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: OTHR 40901. Задаток для участия в торгах по Лоту ____, ОАО «Строймаш», проводимых 28.10.2025.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31-33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании актов в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста: по лотам №№ 2118, 2135, 2162, 2172, 2174, 2175, 2177, 2179 – 7 %, по лотам №№ 2119, 2121-2123, 2131, 2145, 2146, 2149, 2156, 2165-2168, 2173, 2176 – 8 %, по лотам №№ 2120, 2134, 2136-2138, 2140, 2155, 2171 – 9 %, по лотам №№ 2129, 2130, 2132, 2133, 2139, 2141, 2147, 2148, 2150-2153, 2158-2160 – 10 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения торгов. Оплата приобретенного предмета торгов осуществляется согласно договору купли-продажи, но не позднее 15 (пятнадцати) календарных дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться на странице лота на сайте https://orgtorg.by/.
Дополнительная информация по предмету торгов – по тел. **+375293082897, Анаида.**
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов: **+375293808329 Николай Николаевич (пн – пт с 9.00 до 15.30).**
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании действующего законодательства Республики Беларусь

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ОАО «Строймаш» в лице управляющей компании ООО «Партнёр-Консультант» (220033, г. Минск, ул. Рыбалко, д. 26) +375 (44) 505-16-54 (Николай Маркович), info@stroymash.by** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» (220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127) ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

ПАДЗЕЯ

# КАРОТКІ ШЛЯХ ДА ЭКЗОТЫКІ

## «Белавія» адкрыла прамы рэйс на трапічны востраў у В'етнаме

З 11 кастрычніка на востраў Фукуок адкрыўся чартарны рэйс. Гэта яшчэ адзін дальнемагістральны напрамак кампаніі — зусім нядаўна стартавала праграма палётаў на знакаміты кітайскі курорт Санья (востраў Хайнань). А ў хуткім часе авіякампанія абяцае дадаць яшчэ адзін маршрут — на Шры-Ланку.



Новыя маршруты сталі магчымымі дзякуючы папаўненню флоту сучаснымі самалётамі Airbus, якія пераадольваюць больш за восем тысяч кіламетраў.

**Сяргей ЛУКАШЭВІЧ, першы намеснік міністра замежных спраў Беларусі** заявіў у размове з журналістамі: «Стратэгічны ўзровень адносін паміж Беларуссю і В'етнамам неаднаразова падкрэсліваўся кіраўнікамі нашых краін. Імпульсы, якія надае дзяржаўная вертыкаль, садзейнічаюць развіццю супрацоўніцтва на ўсіх узроўнях — ад гандлёва-эканамічных да чалавечых і палітычных кантактаў. Сённяшні прамы рэйс — яшчэ адзін крок на гэтым шляху».

**Ван Чунг Нгуен, Надзвычайны Паўнамоцны Пасол В'етнама ў Беларусі** адзначыў: «Адкрыццё рэйса — гістарычны момант. Я ўпэўнены, што рэйс «Мінск–Фукуок» дазволіць жыхарам Беларусі і В'етнама больш падарожнічаць. Гэта вялікая магчымасць для нашых турыстаў».

«Сапраўды, гэта вялікая падзея для кампаніі і для ўсёй краіны. Паветранае судна можа перавозіць 281 пасажыра ў бізнес- і эканом-класах. Будзе прадастаўляцца двухразовае гарачае харчаванне. Першыя рэйсы запоўнены цалкам, і, паводле інфармацыі турыстычнага аператара, загрузка практычна поўная да вясны», — адзначыў **Глеб ПАРХАМОВІЧ, першы намеснік генеральнага дырэктара па арганізацыі вытворчасці авіякампаніі «Белавія».**

Адправіцца на Фукуок цяпер можна праз беларускіх турыстычных аператараў. Турпакет на дваіх каштуе 2300 долараў за дзесяць начэй. Нормы для ручной паклажы — 5 кілаграмаў, для багажу — 23 кілаграмы ў эканом-класе і 32 — у бізнес-класе. Паміж Беларуссю і В'етнамам працуе бязвізавы рэжым (без візы ў В'етнаме можна знаходзіцца 30 дзён), і гэта значна спрашчае магчымасці для адпачынку.

Так пачынаецца новая старонка ў геаграфіі беларускіх авіяпалётаў — прамы шлях праз паўсвета, што злучае халодную восень Мінска з сонцам і морам далёкага Фукуока. Каля выхаду на пасадку — усмешкі, фота. Хтосьці ўжо марыць пра пляжы Фукуока, іншыя разглядаюць праз вокны аэрапорта самалёт, што будзе пераносіць іх праз аблокі. «Белавія» плануе выконваць рэйсы ў В'етнам адзін раз у адзінаццаць дзён — дастаткова, каб кожны ахвотны паспеў адчуць сябе часткай новай авіяцыйнай гісторыі.

Дарэчы, рэйсы на Фукуок і Хайнань — гэта яшчэ не ўсе прапановы «Белавія» аматарам экзатычнага адпачынку. З 28 кастрычніка кампанія пачне выконваць палётную праграму на востраў Шры-Ланка, у міжнародны аэрапорт Матала, які размешчаны ў паўднёвай частцы вострава, дзе трапічная прыгажосць пачынаецца літаральна адразу пасля пасадкі.

**Міхаіл ДАНІЛКОВІЧ.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 223

Сваю новую задачу прапануе наш чытач Міхаіл Кошаль з Мінска ***(гл. дыяграму)***.



**Белыя:** Кph1, Фа8, Са1, Сd1, пg4 (5).
**Чорныя:** Кpf4, пп. d4, g5 (3).
Мат за 2 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі (вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск, «Звязда») або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Адбыліся першынствы Беларусі па хуткіх шахматах (рапідзе) і бліцы сярод юнакоў і дзяўчат. У рапідзе прызёрамі сталі:

юнакі да 12 гадоў — 1) Савелій Барташ (Мінск); 2) Ціхан Трафімчук (Брэст); 3) Ілья Казлоўскі (Гомель);

юнакі да 14 гадоў — 1) Іван Кажадуб (Светлагорск); 2) Антон Віцюк (Мінск); 3) Аляксандр Дрозд (Мазыр);

юнакі да 16 гадоў — 1) Макар Навуменка (Орша); 2) Аляксандр Дзяркач (Гомель); 3) Захар Шуляк (Орша);

дзяўчаты да 12 гадоў — 1) Марта Кажамякіна (Віцебск); 2) Кіра Буланава (Мінск); 3) Вераніка Мяшкевіч (Гомель);

дзяўчаты да 14 гадоў — 1) Ева Тарасюк (Ліда); 2) Марыя Раманові (Брэст); 3) Варвара Захаранка (Мінск);

дзяўчаты да 16 гадоў — 1) Лізавета Ляшкевіч (Мінск); 2) Мілена Сідарэня (Баранавічы); 3) Вера Мацэральнік (Мінск).

А вось прызёры ў бліцы:

юнакі да 12 гадоў — 1) Ілья Казлоўскі (Гомель); 2) Кірыл Бабейкін (Мінск); 3) Давід Даброўскі (Мінск);

юнакі да 14 гадоў — 1) Радзівон Сідарэня (Баранавічы); 2) Барыс Кахно (Мінск); 3) Захар Емяльянаў (Вілейка);

юнакі да 16 гадоў — 1) Аляксандр Дзяркач (Гомель); 2) Захар Шуляк (Орша); 3) Антон Цімашэнка (Баранавічы);

дзяўчаты да 12 гадоў — 1) Глорыя Гаршкова (Магілёў); 2) Настасся Фядотава (Мінск); 3) Марыя Дудзіна (Мінск);

дзяўчаты да 14 гадоў — 1) Дарыя Скамарошчанка (Брэст); 2) Варвара Захаранка (Мінск); 3) Марыя Рамановіч (Брэст);

дзяўчаты да 16 гадоў — 1) Мілена Сідарэня (Баранавічы); 2) Лізавета Ляшкевіч (Мінск); 3) Ганна Сапрыкава (Віцебск).

* * *

У Мінску адбыўся турнір да 80-годдзя ААН з удзелам 18 каманд. Прызавую тройку склалі зборныя Мінска, Беларусі і РЦАП. Лепшыя вынікі на сваіх дошках паказалі Аляксей Аляксандраў, Мікіта Рама790ўскі, Дзмітрый Кушко, Міхаіл Спіжарны, Уладзімір Верамейчык, Сяргей Гаспаран і Генрыета Лагвілава. А гросмайстар Дзяніс Лазавік правёў сеанс адначасовай гульні.

На Міжнародных юнацкіх спартыўных гульнях у Санкт-Пецярбургу перамагла беларуская зборная, якая выйграла 10 матчаў з 11. За яе выступалі Мацвей Савельеў, Радзівон Сідарэня (які набраў 11 балаў з 11), Ніка Венская і Сафія Карпыза. Адначасова адбыліся анлайн-спаборніцтвы сярод шахматыстаў да 12 гадоў. Тут таксама першай была каманда Беларусі (Дамір Булгак, Барыс Кірэеў, Аліса Малюш, якая набрала 100 % балаў, і Марта Кажамякіна). Нашы суайчыннікі выйгралі 6 матчаў з 7.

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца: 1. Кph2! ~ 2. Лf5+, 1...g3+ 2. Кph3, 1...Кph4 2. g3+. Правільна адказалі Леанід Шацько, Васіль Жуковіч, Ігар Ананіч, Віктар Жук, Васіль Барысевіч, Сяргей Цяльпук.

**Вадзім ЖЫЛКО.**

## Надвор'е на заўтра

| | | Ноч | Дзень |
|---|---|---|---|
| МІНСК | 764 мм рт.сл. | +5..+6 °C | +7..+9 °C |
| ВІЦЕБСК | 762 мм рт.сл. | +2..+3 °C | +7..+9 °C |
| МАГІЛЁЎ | 764 мм рт.сл. | +3..+4 °C | +7..+9 °C |
| ГОМЕЛЬ | 765 мм рт.сл. | +3..+4 °C | +8..+10 °C |
| ГРОДНА | 764 мм рт.сл. | +6..+8 °C | +10..+12 °C |
| БРЭСТ | 765 мм рт.сл. | +5..+7 °C | +9..+11 °C |

Паводле даных Белгідрамета

### ...у суседзяў

МАСКВА +5..+7 °C

С.-ПЕЦЯРБУРГ +8..+10 °C

### Месяц

*Апошняя квадра 13.10.–20.10. Месяц у сузор'і Льва.*

### Геамагнітныя ўзрушэнні

22 гадз., 01 гадз., 04 гадз., 07 гадз., 10 гадз., 13 гадз., 16 гадз., 19 гадз.

Абазначэнні:
— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў
— невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
— слабая геамагнітная бура
— малая геамагнітная бура



Фота Сяргея ЧЫЧЫЛАВА.

## 15 КАСТРЫЧНІКА Даты Падзеі Людзі




**1905** год — нарадзіўся Раман Сямёнавіч Чабатароў (в. Старынка Ушацкага р-на Віцебскай вобл.), беларускі вучоны-паразітолаг, акадэмік НАН Беларусі (1961), акадэмік Акадэміі сельскагаспадарчых навук Беларусі (1959—1961), доктар ветэрынарных навук (1944), прафесар (1944), аўтар больш за 180 навуковых прац, прысвечаных біялогіі ўзбуджальнікаў і пераносчыкаў паразітаў. Распрацаваў методыку вывучэння паразіталагічнай сітуацыі, прапанаваў сістэму мерапрыемстваў па барацьбе з паразітамі сельскагаспадарчых жывёл і чалавека.

**1915** год — нарадзіўся Мацвей Рыгоравіч Кайнаў (г. Крычаў Магілёўскай вобл.), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў Крычаўскага патрыятычнага падполля, удзельнік партызанскага руху на тэрыторыі Крычаўскага раёна ў гады Вялікай Айчыннай вайны. З верасня 1941 г. — кіраўнік падпольнай групы ў Крычаве, якая вяла агітацыю сярод насельніцтва, распаўсюджвала зводкі Саўінфармбюро і лістоўкі, здабывала для партызан зброю і боепрыпасы, разведданыя, арганізоўвала ўцёкі савецкіх ваеннапалонных з Крычаўскага лагера смерці. Загінуў у баі ў 1943 г.




**1582** год — папа Рыгор XIII уводзіць грыгарыянскі каляндар. У Італіі, Партугаліі і Іспаніі за 4 кастрычніка гэтага года ідзе адразу 15 кастрычніка. У іншых краінах новы каляндар быў уведзены пазней.

**1964** год — прыведзены ў дзеянне найбуйнейшы ў свеце нафтаправод «Дружба» працягласцю каля 5 тысяч кіламетраў.

**1967** год — адбылося ўрачыстае адкрыццё помніка-ансамбля «Героям Сталінградскай бітвы» на Мамаевым кургане. Менавіта тут, на «Вышыні 102» (так абазначаўся курган на ваенных картах), у гады Вялікай Айчыннай вайны падчас Сталінградскай бітвы ішлі жорсткія баі. Курган з'яўляўся важным звяном у агульнай сістэме абароны Сталінградскага фронту, паколькі дазваляў таму, хто кантраляваў вяршыню кургана, кантраляваць практычна ўвесь горад, Заволжжа і пераправы праз Волгу.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 12 560. Індэкс 63850. Зак. № 2204.

Нумар падпісаны ў 19.30 14 кастрычніка 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12